

## «ЛІЧАЦЦА ТОЛЬКІ З ЭКАНАМІЧНА ЎСТОЙЛІВЫМІ, МОЦНЫМІ ДЗЯРЖАВАМІ. БУДЗЕМ ПА АДНЫМ — З НАМІ ЦЫРЫМОНІЦЦА НЕ СТАНУЦЬ»

**Падрабязнасці рэзананснага выступлення Прэзідэнта Беларусі ў Савеце Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі**

(Працяг на 2–5 стар.)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 САКАВІКА 2025 г. СУБОТА № 52 (30440)

# ФУНДАМЕНТ ДЛЯ САПРАЎДЫ НАРОДНАЙ ДЗЯРЖАВЫ

***Дарагія суайчыннікі!***

*Віншую вас з Днём Канстытуцыі.*

*Абноўлены пры ўдзеле мільёнаў беларусаў Асноўны Закон стаў фундаментам для пабудовы сапраўды народнай дзяржавы, у якой клопат аб чалавеку з'яўляецца прыярытэтам палітыкі, якая праводзіцца.*

*У Беларусі ствараецца грамадства роўных магчымасцяў, забяспечваецца абарона правоў і свабод грамадзян, умацоўваецца інстытут сям'і, дзейнічае сістэма падтрымкі моладзі, актыўна развіваюцца ахова здароўя, навука і адукацыя. Дзяржава садзейнічае духоўнаму адраджэнню, захаванню культурнай спадчыны і міжканфесіянальнага дыялогу.*

*У год 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне асаблівае значэнне набываюць палажэнні Канстытуцыі, накіраваныя на захаванне гістарычнай праўды аб свяшчэнным подзвігу беларускага народа. Гэту праўду аб героях, якія абаранілі свабоду Радзімы, павінны ведаць і памятаць нашы дзеці і ўнукі.*

*Перакананы, што патрыятызм, згуртаванасць, вернасць канстытуцыйным прынцыпам і каштоўнасцям стануць залогам працвітання і незалежнасці нашай краіны.*

*Жадаю ўсім міру, дабра, дабрабыту і новых здзяйсненняў на карысць Айчыны.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**




Фота БелТА.

ВАЖНЫЯ ДЛЯ ДЗЯРЖАВЫ КНІГІ 13



**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

ISSN 1990 — 763X

ДЗЯРЖАЎНЫ ІНТАРЭС

## ПАКУПНІК ПАД АБАРОНАЙ

**Летась разгледжана амаль 11 тысяч зваротаў спажыўцоў**



За мінулы год Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю, а таксама выканкамамі было разгледжана звыш 10 тысяч зваротаў спажыўцоў, што на 7 % больш, чым у 2023-м.

Па выніках разгляду спажыўцам кампенсавана шкода на суму больш чым 1,6 мільёна рублёў, вынесена 293 прадпісанні аб ліквідацыі парушэнняў, складзены 231 пратакол. Выканкамамі пададзены 161 іск у суд, а сума штрафаў за невыкананне суб'ектамі гаспадарання парадку задавальнення патрабаванняў спажыўцоў склала 348,6 тысячы рублёў, распавяла **начальнік упраўлення абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь Іна ГАЎРЫЛЬЧЫК.**

СТАР. 15

# «ЛІЧАЦЦА ТОЛЬКІ З ЭКАНАМІЧНА БУДЗЕМ ПА АДНЫМ — З НАМІ

## Падрабязнасці рэзананснага выступлення Прэзідэнта Беларусі

**Другі дзень афіцыйнага візіту Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Маскву атрымаўся знакавым і гістарычным. У гэты дзень успаміналі сумеснае мінулае, ушаноўвалі памяць герояў і казалі пра будучыню, якую абавязкова будзем ствараць разам.**



Фота БелТА.

Валянціна Матвіенка ўручыла Аляксандру Лукашэнку ганаровы знак «За заслугі ў развіцці парламентарызму», які з'яўляецца найвышэйшым ведамасным знакам адзнакі Савета Федэрацыі.

У пятніцу свой рабочы дзень беларускі лідар пачаў у Аляксандраўскім садзе, дзе ўсклаў вянок каля Магілы Невядомага салдата. Удзельнікі цырымоніі ўшанавалі памяць загінулых у Вялікай Айчыннай вайне хвілінай маўчання, быў выкананы Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь.

Пасля гэтага Аляксандр Лукашэнка накіраваўся ў Савет Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі, дзе выступіў перад сенатарамі. З гэтай трыбуны Прэзідэнт Беларусі гаварыў упершыню. Члены Савета Федэрацыі сустрэлі беларускага лідара апладысментамі. Вітаючы сенатараў у адказ, Аляксандр Лукашэнка вылучыў галоўную асаблівасць гэтай сустрэчы: «Тут вельмі шмат людзей, якія не проста памятаюць нашу гісторыю, але і рабілі гэту гісторыю. Гэта мы з вамі, людзі дарослыя, убеленыя сівізной. Ужо не тыя, што былі 30—40 гадоў таму. Але мы самыя вопытныя людзі».

Тэмай свайго выступлення кіраўнік дзяржавы вызначыў будаўніцтва Саюзнай дзяржавы, што вельмі важна для двухбаковых адносін.

### «ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ АДКАЗАЛІ НА ПЫТАННЕ, З КІМ МЫ»

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што прэзідэнцкія выбары, якія ў студзені прайшлі ў Беларусі, паказалі выбар народа ў тым, на які бок арыентуецца краіна. «Галасаванне за дзеючую ўладу, за дзеючага Прэзідэнта якраз дае адказ на гэта пытанне, з кім мы і куды», — падкрэсліў ён. «І не трэба нічога прыдумляць, не трэба казаць, што ў нас народ такі-сякі. Вось адказ на пытанне — больш за 90 % народу прыйшло, калі рубам стала пытанне, і адказалі на галоўнае пытанне: "З кім мы?"», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён перакананы, што інакш і быць не павінна. Беларускі і расійскі народы самыя блізкія, што праверана часам і доказана цяперашняй рэчаіснасцю.

Гэты візіт Прэзідэнт назваў асаблівым, бо дзякуючы запрашэнню старшыні Савета Федэрацыі ў беларускага лідара з'явілася магчымасць пагаварыць з прадстаўнікамі расійскіх рэгіёнаў, людзьмі ад зямлі, якія адчуваюць пульс жыцця сваёй краіны. «І самае галоўнае, што ў мяне ёсць магчымасць прадстаўнікам расійскіх рэгіёнаў сказаць вялізны дзякуй за тое, што ў свой час (былі ў нас не лепшыя часы, усяк было, але мы ў Беларусі зрабілі стаўку на работу з рэгіёнамі) мы дзякуючы вам захавалі наша адзінства, — гэтыя словы Аляксандра Лукашэнкі зала прывітала апладысментамі. — Калі б вы тады не падтрымалі беларускія памкненні, у нас не было б сёння такіх адносін. І цяжка сказаць, дзе была б наша Беларусь».

### «МЫ ПАВІННЫ ЦВЁРДА СТАЯЦЬ НА СВАІМ»

Сустрэчу ў Савеце Федэрацыі кіраўнік дзяржавы назваў сімвалічнай яшчэ па адной прычыне. 25 гадоў таму, напярэдадні падпісання Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы, 27 кастрычніка 1999 года Аляксандр Лукашэнка выступаў у Дзяржаўнай Думе і выказваў сваю пазіцыю наконт гэтага падпісання. «Памятаю добра, як я, тады яшчэ «зялёны» Прэзідэнт, пераконваў вашых калег — вопытных парламентарыяў, людзей савецкай загартоўкі — у неабходнасці больш глыбокай інтэграцыі нашых краін. Было зусім не проста. Меркаванні наконт гэтай ідэі ў палітычных колах як у вас, так і ў нас былі розныя. Гэта ўсё яшчэ быў час ілюзій і моды на «нацыянальныя кватэры», свабодную рыначную эканоміку, ліберальныя каштоўнасці і заходнія прынцыпы пабудовы грамадства. Усё адтуль, нам усё гэта падабалася, асабліва ў Расіі, ну і мы ішлі следам за ёй, — падзяліўся сваімі ўспамінамі беларускі лідар. — Нягледзячы на абвешчанае завяршэнне халоднай вайны, Захад паслядоўна, ужо па інерцыі рэалізоўваў сваю шматгадовую стратэгію развалу таго, што засталося ад СССР. Але ўжо тады, праз восем гадоў пасля Белавежскіх пагадненняў, было відавочна, што ў адзіночку і ў эканамічным, і ў палітычным плане выстаяць праблематычна, нават немагчыма». Прэзідэнт працытаваў Уладзіміра Маякоўскага: «Горе одному, один не воин — каждый дюжий ему господин, и даже слабые, если двое».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што Беларусь і Расія спаўна адчулі праслаўтыя дэмакратыю і свабодны рынак. «Мы ўбачылі, што сяброўскай падтрымкі ад Захаду чакаць не варта. Хутчэй, пры любым зручным выпадку паставяць падножку і здрадзяць не задумваючыся. Цяпер мы гэта ўжо разумеем. Пакуль мы спрабавалі ўстаць на ногі, сабраць па частках разбураныя сувязі, хоць неяк зляпіць бюджэт, накарміць народ, нашы заходнія партнёры часу дарма не гублялі», — сказаў ён. У прыклад беларускі лідар прывёў чарговую хвалю пашырэння НАТА ў 1999 годзе, якое пасля ўступлення ў яго Чэхіі, Польшчы і Венгрыі ўшчыльную наблізілася да нашых граніц. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што, абмяркоўваючы гэтыя пытанні з Барысам Ельцыным, яны вельмі абураліся, але зрабіць тады нічога не маглі. Ён згадаў і словы Уладзіміра Пуціна, які пра тыя падзеі сказаў проста: «Нас падманулі». Па словах беларускага лідара, сітуацыя амаль паўтараецца і сёння. «Цяпер ставіцца пытанне: а як будзе, а што, а вось там амерыканцы, украінцы... Я нават не гавару, што нас могуць падмануць наступны раз. Я кажу: вакол пальца ўжо нас ніхто не абвядзе.

**Таму што мы ведаем, чаго мы хочам, і мы чарговы раз з Прэзідэнтам Расіі дамовіліся: мы павінны цвёрда стаяць на сваім. Разумна. Мы за мір, мы супраць усялякай вайны. Але мы павінны бачыць свае інтарэсы», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.**

Ён звярнуў увагу на заявы Прэзідэнта ЗША: «Дональд Трамп як бульдозер прайшоўся па ЗША, і здарылася неверагоднае. Гэты неверагодны чалавек перамог. Але куча рознага роду заяў, абяцанняў, ціску то на адзін бок, то на другі... Пакуль блытаніна. У ЗША пакуль няма ніякага плана нават па Украіне. Так, Дональд хоча спыніць гэта. Дзякуй яму за гэта, калі ён шчыра перажывае за тое, што гінуць людзі і трэба гэта спыніць, дзякуй яму. Мы за гэта. Але пры гэтым мы павінны цвёрда стаяць на сваіх пазіцыях. Нас ніхто не павінен некуды саштурхнуць убок. І крый божа падмануць нас ці абвесці вакол пальца. Гэтага не адбудзецца».

Прэзідэнт працягнуў праводзіць паралелі з мінулымі падзеямі. Ён нагадаў, як натаўскія бамбардзіроўкі Югаславіі канчаткова пераканалі ўсіх як у сапраўдных мэтах Альянсу, так і ў тым, што дэклараваныя Захадам прынцыпы мірнага суіснавання і міжнароднае права насамрэч больш нічога не здольныя гарантаваць. «Гэта міжнароднае права было растаптана на вачах ва ўсіх», — канстатаваў ён.

### ДА КРОКАЎ ПА ЗБЛІЖЭННІ ПАДШТУРХНУЛА САМО ЖЫЦЦЁ

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што не ставарала надзейных апор і ўнутраная сітуацыя. Крызіс у эканоміцы і грамадстве, мітусня з перадзелам дзяржаўнай уласнасці і павальная карупцыя. «Мы зразумелі, што разлічваць трэба толькі на сябе. **Само жыццё падштурхнула нас да больш рашучых крокаў па збліжэнні, фарміраванні сумесных гарантый эканамічнай і ваеннай бяспекі.** Разам з першым Прэзідэнтам Расіі Барысам Мікалаевічам Ельцыным, за што я яму вельмі ўдзячны, і пры падтрымцы народаў нашых краін, найперш расіян, мы прынялі адзіна правільнае рашэнне — аб стварэнні Саюзнай дзяржавы. Адкінулі ўсе апасенні, хто каго можа паглынуць, хто кім будзе кіраваць, хто і што атрымае ў выніку», — успомніў, як усё было, Прэзідэнт. Ён таксама прыгадаў, што ў ходзе галасавання ў Савеце Федэрацыі ў 2000 годзе прыняцце дагавора падтрымалі 158 сенатараў. Ніхто не выказаўся супраць, толькі двое ўстрымаліся.

«Мяркую, што сёння ўжо нікога не трэба пераконваць у правільнасці зробленага выбару, — заявіў беларускі лідар. — Хоць перыядычна з'яўляюцца яшчэ нейкія гарачыя галовы, плодзяць нарытывы аб незбалансаванасці выгод, утрыманстве Мінска, неабходнасці ўваходжання Беларусі ў склад Расіі, з'едліва гавораць аб нашым саюзе». Аляксандр Лукашэнка адказаў гэтым гарачым галовам: «Але калі 25 гадоў не хапіла, каб ацаніць добрыя якасці мадэлі інтэграцыі дзвюх суверэнных дзяржаў, то грош цана падобным так званым мазгавым цэнтрам і экспертам. Мы ішлі ад жыцця. І жыццё расставіла ўсе кропкі над «і». У нашай краіне няма русафобіі, захоўваюцца паважлівыя адносіны да агульнай гісторыі, рэлігіі і традыцый».

Прэзідэнт расказаў, што часта кажа свайму расійскаму калегу аб тым, што нават калі б цяперашніх санкцый не было, іх трэба было б прыдумаць. Менавіта яны паказалі, што Беларусь карысная і патрэбная Расіі. У нашай краіне ёсць нямала таго, што Расіі крайне неабходна. Аляксандр Лукашэнка згадаў, як пасля ўвядзення санкцый было шмат хваляванняў наконт прадукцыі мікраэлектронікі. Але аказалася, што беларускія спецыялісты, якія валодаюць вялікімі ведамі і кампетэнцыямі, замянілі замежныя мікрачыпы і іншую прадукцыю мікраэлектронікі. Былі мабілізаваны намаганні, усё атрымалася, і сістэма працуе, заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Больш за тое, звярнуў увагу ён, дзякуючы расійскім калегам мікраэлектроніка ў Беларусі сёння развіваецца сямімільнымі крокамі. «Вырабіць мы можам усё. Галоўнае — гэта цана і час. Мы сёння робім усё, што трэба для Расіі», — дадаў

# ЎСТОЙЛІВЫМІ, МОЦНЫМІ ДЗЯРЖАВАМІ. ЦЫРЫМОНІЦЦА НЕ СТАНУЦЬ»

**ў Савеце Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі**

Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама звярнуў увагу, што расіянам у Беларусі жывецца не горш, чым у Расіі, яны адчуваюць сябе як дома. «Так будзе заўсёды», — заявіў беларускі лідар.

## БЕЛАРУСЬ РАСІЮ Ў АДЗІНОЧКУ НЕ ПАКІНЕ

Прэзідэнт нагадаў свае словы, сказаныя некалькі гадоў таму, аб тым, што Беларусь ніколі не дазволіць нанесці ўдар у спіну свайму старэйшаму брату — расіянам. «Не здраджваем мы гэтаму абяцанню і сёння, надзейна абараняючы і aберагаючы наш Саюз. Мы не дрэйфуем ні ў адзін бок, ні ў другі. Хаця нярэдка асобныя расійскія палітыкі, эксперты і журналісты дазваляюць сабе такія абвінавачванні. Беларусь заўсёды праводзіла і праводзіць шматвектарную (ці, як сёння модна казаць, шматпалярную) знешнюю палітыку. Чым гэта адрозніваецца ад Расіі? Нічым», — падкрэсліў ён. Кіраўнік дзяржавы тлумачыць гэта нашым геаграфічным становішчам і адкрытасцю эканомікі. У Беларусі адносіны стратэгічнага і ўсепагоднага партнёрства з Кітайскай Народнай Рэспублікай. Беларускі бок зацікаўлены ва ўсебаковым супрацоўніцтве з краінамі СНД, ШАС і БРІКС. Нам трэба гандляваць з дзяржавамі Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Мы жадаем добрых адносін з суседкай Еўропай і ЗША.

«Але заўсёды галоўным прыярытэтам былі і будуць нашы асаблівыя, самыя блізкія, брацкія адносіны з Расіяй. Мы ўвесь час пра гэта адкрыта казалі. **А на любыя прэтэнзіі аб нашай падтрымцы вас я нязменна адказваю: калі нам давядзецца выбіраць, мы заўсёды будзем на баку Расіі. Інакш не можа быць. Беларусь Расію ў адзіночку не пакіне, таксама як і Расія не пакіне нашу Беларусь**», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, гэта выбар беларускага народа, зроблены на рэферэндуме 1995 года, калі руская мова атрымала статус дзяржаўнай і людзі падтрымалі курс Прэзідэнта на эканамічную інтэграцыю з Расіяй (гэта было асобнае пытанне ў бюлетэні). «Няўжо мы за 30 гадоў (вялікі юбілей) хоць на адзін крок адступілі ад тых гістарычных рашэнняў? — задаў рытарычнае пытанне кіраўнік дзяржавы. — Магутныя стартавыя ўмовы беларуска-расійскай інтэграцыі стварылі моцны фундамент яе ўстойлівасці і шырокія магчымасці для развіцця ў ваеннай, эканамічнай і палітычнай сферах».

Да такіх сфер Аляксандр Лукашэнка аднёс глыбокую агульную гісторыю нашых народаў, адзіныя арыенціры і падобныя нацыянальныя інтарэсы. «Беларусь знаходзіцца ў цэнтры Еўропы, пад Полацкам — геаграфічны цэнтр Еўропы. Вы выдатна ведаеце, як нас тузалі, трапалі заўсёды. І не толькі Напалеон, фашысты хадзілі туды-сюды па краіне, і ад краіны нічога не заставалася. Нам даставалася і акрамя гэтых буйных ваенных падзей. Заўсёды мы былі на гэтым зломе. Але ніхто з вас не скажа, што нават у самыя цяжкія часы мы былі не з рускімі людзьмі, не з расіянамі. Мы заўсёды глядзелі ў гэты бок, таму што наш народ дакладна разумеў, што тут наша шчасце і тут наша будучыня», — падкрэсліў ён, дадаўшы, што гэта векавыя спадзяванні нашых людзей.

Да магутных стартавых умоў беларускі лідар аднёс і мэтазгоднасць аб'яднання, звязаную з геаграфічнымі і інфраструктурнымі перавагамі. Ён звярнуў увагу і на пастаянную нацэленасць на канкрэтны вынік, паколькі інтэграцыя цягне за сабой пашырэнне магчымасцяў для нашых грамадзян і арганізацый.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ўнутранай устойлівасці Саюзу дадалі нарматыўна замацаваныя стратэгічныя падыходы. Прынятыя 28 галіновых праграм дазволілі ўніфікаваць заканадаўства, запусціць імпартазамяшчальныя праекты і, па сутнасці, удыхнуць новае жыццё ў падпісаны ў 1999 годзе саюзны дагавор. Разам з тым кіраўнік дзяржавы згадаў, што падчас прыняцця гэтых праграм была пэўная насцярожанасць. Ён расказаў, што прапаноў па праграмах было больш, але прэзідэнты Беларусі і Расіі вызначыліся, што гэта павінны быць праграмы, якія сёння можна рэалізаваць. І гэтыя 28 праграм сёння рэалізавалі.

> **«Унікальнасць Саюзнай дзяржавы ў тым, што яна з'яўляецца больш дасканалым фарматам двухбаковых адносін, аналагаў якому ў свеце няма».**

«Дзякуючы нашай сумеснай рабоце гэта жывы арганізм, які дазваляе ў залежнасці ад абставін выбіраць патрэбныя нам інструменты, выпрацоўваць і апрабоўваць новыя метады работы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Яскравым прыкладам таму ён назваў паспяховае супрацьстаянне шалёным санкцыям Захаду. «Менавіта дадзены фармат у поўнай меры забяспечвае бяспеку ў шырокім сэнсе — ад эканамічнай і інфармацыйнай да ваеннай, дэманструе высокі ўзровень кааперацыі на фоне лагістычных збояў і праблем з фінансавымі разлікамі. Нягледзячы на розны рэсурсны патэнцыял Беларусі і Расіі, мы арганічна дапаўняем адна адну, а таксама ўзаемаадназўляем існуючыя ў кожнага з нас прабелы, аб'ядноўваем перавагі кожнай краіны», — растлумачыў беларускі лідар.

Для таго, каб гэта праілюстраваць, Прэзідэнт абазначыў некалькі прыкладаў.

## ПРАЦУЕМ ЯК РАЎНАПРАЎНЫЯ ПАРТНЁРЫ

Гэта перш за ўсё эканоміка. У дадзеным выпадку лепей за ўсё кажуць лічбы. Аляксандр Лукашэнка прывёў некалькі паказчыкаў за 25 гадоў. Аб'ём ВУП у намінальным выяўленні ў Беларусі вырас больш як у 6 разоў, у Расіі — у 10 разоў; аб'ём ВУП на душу насельніцтва ў Беларусі — амаль у 7 разоў, у Расіі — амаль у 11 разоў; гандлёвы абарот вырас у 7 разоў і летась склаў 60 мільярдаў долараў (58,9). Пры гэтым, нягледзячы на найскладанейшую знешнюю кан'юнктуру, рэкордныя паказчыкі дасягнуты ў апошнія тры гады (з 2022 да 2024 года).

«І самае галоўнае — істотна выраслі рэальныя даходы грамадзян, палепшылася якасць іх жыцця, — зрабіў акцэнт кіраўнік дзяржавы. — Значыць, гэты саюз выгадны найперш нашым людзям». Разам з тым, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, называючы станоўчыя моманты, ён далёкі ад самалюбавання. Яшчэ вельмі шмат праблем трэба вырашыць.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што ў расійскіх СМІ звычайна вельмі сціпла згадваюць ці не гавораць зусім аб тым, што дзякуючы кааперацыйным сувязям, якія падтрымліваюцца з Беларуссю, больш за 3 мільёны расіян маюць пастаянную крыніцу даходаў. А гэта дзясяткі тысяч прадпрыемстваў, шырокі спектр прадукцыі і паслуг. «Нягледзячы на розны маштаб эканомік, многія апрабаваныя падыходы да падтрымкі прадпрыемстваў, абароны рынку і інвестыцый мы гармануізем і сінхранізуем. Асабліва апошнім часам, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Задача нязменная, як і 25 гадоў таму, — забяспечыць рэалізацыю адзінай прамысловай, тэхналагічнай і навукова-тэхнічнай палітыкі. Мяркуючы па апошніх рашэннях, у Расіі запатрабаваны беларускі вопыт у галіне планавання, а таксама дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Але трэба яшчэ больш рабіць, на маю думку. Нам трэба навучыцца мабілізоўвацца, нягледзячы на вялізныя памеры Расіі. Асабліва гэта актуальна цяпер». Такі падыход, па словах Аляксандра Лукашэнкі, ні ў якім разе не супярэчыць ліберальным і рыначным падыходам. «Калі лібералізм і рыначныя падыходы садзейнічаюць мабілізацыі, а яна патрэбная асабліва ў гэтых умовах, дык дзякуй. Мы гэта падтрымліваем. Мы звяртаем на гэта самую пільную ўвагу», — растлумачыў ён.

## ВЫСОКІМІ ТЭХНАЛОГІЯМІ КАРЫСТАЦЦА, АЛЕ ТРЫМАЦЬ НА КАНТРОЛІ

Беларусь, у сваю чаргу, запазычвае ў Расіі падыходы да стварэння лічбавых тэхналогій, пабудаваных на іх аснове дзяржаўных сэрвісаў, электронных платформ. Але і беларускі бок нямала зрабіў у гэтым плане. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што, калі ў Расіі толькі думалі аб IT-тэхналогіях, у Беларусі ўжо стварылі Парк высокіх тэхналогій. «Ведаеце, у чым была наша памылка, — мы не стварылі канчатковага прадукту ні для вас, ні для сябе. У высокатэхналагічных кампаній. Мы былі там другараднымі людзьмі. У 2020 годзе мы ў гэтай сістэме атрымалі добры ўдар па галаве. Я заўсёды задаваў сабе пытанне: як так магло быць? Я фактычна валявым рашэннем стварыў гэты парк, сцягнулі самых дасведчаных, самых лепшых людзей, стварылі ўмовы. І яны першымі выступілі супраць гэтай улады. Усё вельмі проста — не яны. Не яны. Гэта адтуль, іх мацярынскія кампаніі, давалі каманду групам, якія ў парку былі створаны, зараблялі немалыя грошы, падаткі плацілі невялікія, мы іх у гэтым плане падтрымлівалі. Але там, у Амерыцы, далі каманду «бамбіць», па гэтых напрамках ішло фінансаванне, і на вуліцы вывалілі ў першых радах яны. Цяпер адумаліся, прызнаюцца, што яны адурманіліся. Мы гэта чуем, не зусім верым, але чуем і трымаем на кантролі», — расказаў расійскім сенатарам беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка заклікаў спакойней ставіцца да штучнага інтэлекту. Па яго словах, ім трэба займацца, але забягаць занадта далёка наперад нельга. «Так, каб грамадства ўвогуле не разумела і не ўспрымала гэтых крокаў — нікому гэта не трэба, — растлумачыў ён. — Так, трэба на паўкроку, на крок ісці наперадзе. Наша агульная гісторыя гэтаму вучыць.



Фота БелТА.

Працяг на 4-й стар. ►

# «ЛІЧАЦЦА ТОЛЬКІ З ЭКАНАМІЧНА БУДЗЕМ ПА АДНЫМ — З НАМІ

Але так ісці, каб ззаду засталіся людзі, для якіх мы гэта робім, — недапушчальна. Мы адарвёмся ад людзей. Таму мы спакойна займаемся высокімі тэхналогіямі».

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што нават замежныя спецыялісты высокага ўзроўню, з якімі ён размаўляў і якія займаюцца тэмай штучнага інтэлекту, не ведаюць, да чаго можа прывесці ў выніку развіццё гэтай тэхналогіі. Але займаюцца таму, што выгадна.

## САНКЦЫІ ПАЙШЛІ НА КАРЫСЦЬ ТЭХНАЛАГІЧНАМУ СУВЕРЭНІТЭТУ

Прэзідэнт адзначыў, што супрацоўніцтва ў галіне мікраэлектронікі і вытворчасці кампанентнай базы ўносіць важкі ўклад у работу такіх расійскіх гігантаў, як «Раскосмас», «Расатам», «Растэх», «Алмаз-Антэй». «Нам удалося захаваць, а па шэрагу пазіцый аднавіць міжгаліновае супрацоўніцтва і прамысловую кааперацыю. Калі шчыра, санкцыі нават пайшлі нам на карысць. І гэтым мы канчаткова загналі ў тупік іх аўтараў. Негатыву мора. Але яны нас падагналі, яны паказалі, дзе мы знаходзімся, на якім узроўні, што з намі будзе і што мы можам. Літаральна за тры гады мы пабудавалі контуры прамысловага і тэхналагічнага суверэнітэту на дзесяцігоддзі наперад», — падкрэсліў беларускі лідар. У прыклад ён прывёў авіябудаванне. Маючы магчымасць супрацоўнічаць з замежнымі партнёрамі, закупляючы імпартныя камплектуючыя, на ўласнае развіццё гэтай галіны не звярталі належную ўвагу. Але, калі гэтыя магчымасці зніклі, сталі працаваць самастойна.

Яшчэ адзін прыклад: у Саюзнай дзяржаве рэалізоўваюцца перспектыўныя імпартазамяшчальныя інвестыцыйныя праекты. Іх выкананне дазваляе забяспечваць замяшчэнне крытычнага імпарту, выпуск высокатэхналагічнай прадукцыі. На БелАЗе выпушчаны 45-тонны самазвал з газавым рухавіком расійскай вытворчасці. Выдаткі на паліва скараціліся ў два разы, а выкіды ў атмасферу — у 10 разоў. Цяпер вядуцца сумесныя работы па выпуску 90-тоннага газаматорнага самазвала.

У праекце «Саюзны станок» назва гаворыць сама за сябе. «Мы ствараем станкі з камплектуючых, выраблены выключна ў Беларусі і Расіі. Кампетэнцыі прадпрыемстваў размеркаваны, першая партыя атрымала добрыя водгукі, ёсць попыт», — заўважыў беларускі лідар. Але, па яго словах, сітуацыя са станкабудаваннем няпростая. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў савецкі час Беларусь была цэнтрам станкабудавання. І ўсе гэтыя прадпрыемствы, школы і кампетэнцыі захаваны. Сёння дзякуючы расійскім інвестыцыям ствараюцца якасныя станкі, запатрабаваныя на беларускіх і расійскіх прадпрыемствах. «Мы хутка змаглі мабілізавацца і падняцца. Запушчаны амбіцыйны праект па стварэнні сумеснага лёгкаматорнага самалёта. Ён у Беларусі будзе зусім хутка. Для нас авіябудаванне — новая галіна эканомікі», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

## «БЕЛАРУСЬ ДЛЯ РАСІІ АДКРЫТА, НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА РОЗНЫЯ ПАТЭНЦЫЯЛЫ»

Працягваючы размову пра эканоміку, Аляксандр Лукашэнка асобна спыніўся на тэме рэгіянальнай работы. «**Калі казаць зусім ужо шчыра, то Саюзная дзяржава жыве дзякуючы моцным сувязям паміж абласцямі Беларусі і расійскімі рэгіёнамі. Сёння мы, прэзідэнты і ўрады, прыслухоўваемся і рэалізоўваем прапановы і праекты кіраўнікоў на месцах.** Махавік усебаковага ўзаемадзеяння з рэгіёнамі ў нас раскручаны ў поўнай меры. Працэс разнахуткасны, і недзе хацелася б паскорыць. Але мяч не на нашым баку. Беларусь для Расіі адкрыта, нягледзячы на розныя патэнцыялы. Гэта пацвярджаюць насычаны графік паездак у Беларусь расійскіх губернатараў ад Смаленска да Сахаліна і візіты ў адказ у вашы рэгіёны членаў беларускага ўрада і прадстаўнікоў дырэктарскага корпуса», — сказаў ён.

Асобна кіраўнік дзяржавы вылучыў Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Па яго словах, дзякуючы гэтаму форуму, які праводзіцца пад патранатам беларускіх і расійскіх сенатараў, сувязь рэгіёнаў захоўваецца, а скарбонка паспяховых праектаў пастаянна папаўняецца. Толькі летась у рамках дадзенага мерапрыемства падпісаны кантракты на суму больш за 1 мільярд беларускіх рублёў. «Упэўнены, што пад кіраўніцтвам старшынь нашых палат парламента Валянціны Іванаўны (Матвіенка. — **«Зв.»**) і Наталлі Іванаўны (Качанавай. — **«Зв.»**) сёлета Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў Ніжнім Ноўгарадзе збярэ яшчэ больш удзельнікаў і гасцей. Мы дамовіліся з Прэзідэнтам Расіі, што абавязкова прыедзем на гэты форум», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.



Фота БелТА.

## «МЫ ДАМОВІЛІСЯ РАЗАМ АБАРАНЯЦЬ НАШУ АГУЛЬНУЮ АЙЧЫНУ»

Вельмі важны кірунак супрацоўніцтва на прасторы Саюзнай дзяржавы — бяспека. **«Я сёння ўжо казаў, і досвед Савецкага Саюза гэта пацвердзіў: лічацца толькі з эканамічна заможнымі, моцнымі дзяржавамі і саюзамі. Будзем па адным — з намі цырымоніцца не стануць. Таму мы з Прэзідэнтам Расіі дамовіліся разам абараняць нашу агульную Айчыну»**, — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адзначыў, што Беларусь пастаянна называлі самай савецкай рэспублікай. І нагадаў, што ён быў адзіным дэпутатам з усяго беларускага парламента, які выступаў супраць распаду Савецкага Саюза. Але не знайшлося людзей, якія б маглі абараніць СССР. І ў гэтых рэаліях прыйшлося супрацоўнічаць інакш, але спакойна, крок за крокам, з улікам узаемных інтарэсаў. Менавіта на гэтых прынцыпах і грунтуецца Саюзная дзяржава. Па словах кіраўніка Беларусі, з клішэ, якія засталіся пасля савецкіх часоў, накшталт агульнай валюты ці агульнага парламента, сёння працаваць нельга. Тым больш што цяпер прыйшло новае пакаленне, якое жыве ў незалежных, суверэнных дзяржавах. Беларускі лідар нагадаў, што пры інтэграцыйным будаўніцтве хапала рознагалоссяў, канфліктаў, часам даводзілася хадзіць па тонкім лёдзе, але ўсе яны былі вырашаны і знойдзена ўзаемаразуменне.

Але пытанні бяспекі — справа агульная. Аляксандр Лукашэнка згадаў, як, наведваючы Югаславію, якая пакутавала ад натаўскай бамбёжкі, зразумеў, што трэба быць гатовымі да ўсяго, бо ў Захаду «звярынае аблічча». А для таго каб супрацьстаяць выклікам і пагрозам, трэба трымацца разам. «Сёння ў нашым арсенале Рэгіянальная групоўка войскаў Беларусі і Расіі і Адзіная рэгіянальная сістэма СПА. Адзіная. Нам перададзена тактычная ядзерная зброя, хутка на ўзбраенне беларускай арміі паступяць найноўшыя комплексы гіпергукавой зброі «Арэшнік», — сказаў беларускі лідар. Паводле яго слоў, у Беларусі вырабляюцца некаторыя складнікі для «Арэшніка» і да канца года плануецца завяршыць выраб пускавых установак. А далей сумесна з расійскім бокам трэба вызначыцца з месцам размяшчэння.

«З прыняццем Ваеннай дактрыны і Канцэпцыі бяспекі Саюзнай дзяржавы, Дагавора аб гарантыях бяспекі ў рамках Саюзнай дзяржавы мы выйшлі на беспрэцэдэнтны ўзровень стратэгічнага партнёрства і каардынацыі дзейнасці ў ваеннай сферы», — заўважыў Прэзідэнт. Ён шчыра падзякаваў сенатарам за ратыфікацыю Дагавора.

«Ключавыя пастулаты гэтых дакументаў, такія як прыярытэт папераджальных мер, непадзельная бяспека, раўнапраўе і ўзаемны ўлік інтарэсаў усіх дзяржаў, афармілі саюзны стандарт бяспекі», — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка.

## АД ДРУГОЙ АЭС ДА КЛЕТАЧНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

Прэзідэнт нагадаў, што на пачатковым этапе нашы сумесныя саюзныя праграмы вырашалі задачы падтрымання асобных прадпрыемстваў і галін. Ён згадаў такія праграмы, як «Саюзны тэлевізар» або «Саюзны рухавік». Па словах беларускага лідара, гэта былі прыватнасці, але гэта трэба было рабіць і ад гэтага ішлі. «Цяпер праграмы Саюзнай дзяржавы накіраваны на стварэнне і развіццё новых перадавых кірункаў навукі і тэхнікі», — дадаў ён. Свае словы Прэзідэнт пацвердзіў канкрэтнымі фактамі. Толькі па касмічнай тэматыцы з удзелам НАН Беларусі рэалізавана восем праграм. Летась у сакавіку на арбіту быў дастаўлены экіпаж з першай беларускай жанчынай-касманаўткай. Распрацаваны і эксплуатуецца расійска-беларускі касмічны апарат у складзе групоўкі спадарожнікаў для дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі. Вядзецца стварэнне новага спадарожніка са звышдакладным раздзяленнем да 35 сантыметраў.

> **«Будаўніцтва Беларускай АЭС стала самым высокатэхналагічным і маштабным праектам у гісторыі беларуска-расійскіх адносін. Беларускія спецыялісты-атамшчыкі мелі добрую рэпутацыю ў Савецкім Саюзе і за яго межамі. Нам ніяк нельга было канчаткова страціць гэту інтэлектуальную базу», — прывёў яшчэ адзін яскравы прыклад Аляксандр Лукашэнка.**

— Вялізны вам дзякуй і вашаму Прэзідэнту за тое, што вы выканалі маю просьбу. Па-першае, мы пабудавалі станцыю, пасля Фукусімы гэта не так проста было. Добрая станцыя. Яна дэманструе добрыя вынікі.

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што будаўніцтва беларускай АЭС для яго было важным, найперш для таго, каб не страціць кампетэнцыі. Хоць у «чарнобыльскай» рэспубліцы гэта было няпроста. Прыйшлося пераконваць людзей у тым, што гэта бяспечна, чым асабіста займаўся Прэзідэнт. І людзі паверылі. Аляксандр Лукашэнка расказаў расійскім сенатарам пра тое, што ў Беларусі пачалі будаваць дамы, якія абаграваюцца электрычнасцю, чым насельніцтва вельмі задаволенае. Таму пытанне аб будаўніцтве другой АЭС сёння вельмі актуальнае. Тым больш што ўсё, акрамя рэактара, беларусы ўжо могуць рабіць: расійскія партнёры навучылі нашых спецыялістаў, далі тэхналогіі і кампетэнцыі. І цяпер беларускія спецыялісты запатрабаваны і ў іншых краінах. А калі другая АЭС будзе пабудавана на ўсходзе Беларусі, то гэта будзе зручна і расійскім рэгіёнам. Аляксандр Лукашэнка перакананы, што ў хуткім часе і заходнія краіны будуць купляць электраэнергію ў Беларусі, што больш выгадна. «Гэты праект аб'яднаў навуковыя і інжынерныя школы, дзясяткі прадпрыемстваў і тысячы спецыялістаў дзвюх краін, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — **Гэта была мая мара, якую вы са сваім Прэзідэнтам дапамаглі для беларусаў ажыццявіць».**

Беларускі лідар прывёў яшчэ вельмі красамоўныя прыклады. Так, сумесна з расійскім бокам прапрацоўваецца стварэнне Цэнтра ядзерных даследаванняў і тэхналогій. «Унікальныя распрацоўкі для лячэння дзяцей з паталогіяй пазваночніка, анкалагічных, неўралагічных і іншых захворванняў з выкарыстаннем клетачных тэхналогій сталі сапраўдным прарывам у сістэмах аховы здароўя нашых краін. Мы навучыліся самі вырабляць медыцынскія тавары найвышэйшага класа ў галіне артапедыі і траўматалогіі. Гэтыя і іншыя кірункі замацаваны ў Стратэгіі навукова-тэхналагічнага развіцця Саюзнай дзяржавы

# ЎСТОЙЛІВЫМІ, МОЦНЫМІ ДЗЯРЖАВАМІ. ЦЫРЫМОНІЦЦА НЕ СТАНУЦЬ»

да 2035 года. Мы ўжо вярнуліся і да таго, што планаваць трэба», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

## «МЫ Ж ГАВОРЫМ АБ АДЗІНЫХ РЫНКАХ»

«Сутнасць мадэлі Саюзнай дзяржавы заключаецца ў паглыбленай інтэграцыі, імкненні да стварэння адзінай эканамічнай прасторы з захаваннем палітычнага суверэнітэту кожнай краіны, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Прыйдуць часы — хто ведае, што там зробяць нашы дзеці. І сярод вас тут шмат маладых сенатараў, вам давядзецца вырашаць гэтыя праблемы. Мая вам парада — ідзіце, абапіраючыся на зямныя патрэбы, ідзіце ад зямлі, будзе менш памылак».

Прэзідэнт прызнаўся, што рады таму, што нарэшце ў Саюзнай дзяржаве прыйшлі да таго, што без пабудовы працоўнага базісу эканомікі — аб'яднаных рынкаў першасных энергарэсурсаў — не можа быць эфектыўнага руху наперад у пытаннях далейшай інтэграцыі. У снежні 2024 года прэзідэнты падпісалі Дагавор аб фарміраванні аб'яднанага рынку электрычнай энергіі. «Гэта добры крок, але трэба рухацца далей. Што вы трымаецеся за нафту, газ? У вас жа дзяваць іх няма куды. Давайце дамаўляцца», — прапанаваў кіраўнік дзяржавы, зрабіўшы акцэнт на неабходнасці стварэння спрыяльных і роўных умоў гаспадарання для суб'ектаў абедзвюх краін.

Беларусь заўсёды адгукаецца і прыходзіць на дапамогу, калі гэта патрэбна расійскаму боку, падкрэсліў Прэзідэнт. Так было і апошнім часам, калі ўзнікала неабходнасць у дадатковых пастаўках дызельнага паліва, бензіну, электраэнергіі. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў Беларусі нафтаперапрацоўчыя заводы здольныя перапрацаваць некалькі дзясяткаў мільёнаў тон нафты. Прадпрыемствы былі мадэрнізаваны па апошнім слове тэхнікі, аднак цяпер з-за няроўных умоў пры пастаўцы сыравіны іх работа перастае быць прыбытковай. Але ва ўрон прадпрыемствы працаваць не могуць. «Не трэба 30 працэнтаў прыбытку для пашыранай вытворчасці. Няхай гэта будзе 7-8 працэнтаў рэнтабельнасці. Але трэба захаваць гэтыя заводы. Гэта для нас трэба», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, ён абмяркоўваў гэтую праблему са сваім расійскім калегам, і Уладзімір Пуцін пагадзіўся, што трэба разам яе вырашаць. «Будзем думаць, як нам гэту формулу маляваць. Ва ўрадах гэта трэба зрабіць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, гэта датычыцца не толькі нафты, але і ўзнаўлення на іншыя энергарэсурсы, у прыватнасці на газ. «Мы ж гаворым аб адзіных рынках. Мы ж не просім: дайце гэта, дайце тое, — заўважыў Прэзідэнт. — Мы павінны на рынкавых умовах, як і па электраэнергіі, гэта зрабіць. У нас ёсць гэта праблема, і нашы ўрады не могуць гэту праблему вырашыць нават цяпер, калі мы спінай да спіны стаім і адстрэльваемся на пэўных пазіцыях».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на меркаванне, якое цяпер актыўна гучыць, накont таго, што ў інтэграцыі Беларусі і Расіі трэба ісці далей перш за ўсё ў стварэнні адзіных парламента, органаў кіравання і гэтак далей. Па яго словах, найперш трэба вырашыць праблемы, якія ляжаць на паверхні, а пасля ўжо паглыбляцца ў палітычнай інтэграцыі. «На гэтым этапе важна таксама акцэнтаваць увагу ў саюзным будаўніцтве на такіх кірунках, як стварэнне перспектыўных мадэляў беспілотнай тэхнікі і электрамабіляў, мікраэлектроннай базы шырокага кола прымянення, распрацоўка тэхнічных сродкаў у галіне аднаўляльных і неаднаўляльных энергакрыніц, перш за ўсё атамнай энергетыкі, развіццё сістэмы дакладнага земляробства, — заявіў Прэзідэнт. — На мой погляд, за мінулыя гады наш саюз дастаткова адужэў і гатовы перайсці да аб'яднання рынкаў газу, нафты і нафтапрадуктаў».

## ЛАГІСТЫКА — КАТЭГОРЫЯ НЕ ТОЛЬКІ ЭКАНАМІЧНАЯ

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на яшчэ адно актуальнае пытанне. Па яго словах, вялікае значэнне для Беларусі мае мадэрнізацыя транспартнай інфраструктуры, асабліва да марскіх партоў. Ён растлумачыў, што ў Беларусі ёсць партовыя магутнасці пад Санкт-Пецярбургам. Але можна было б пашырыць свае пастаўкі праз парты, што пакуль немагчыма з-за недастатковай прапускной здольнасці чыгункі, асабліва па тэрыторыі Расіі. Адзін з варыянтаў вырашэння праблемы — аднаўленне раз'ездаў, якія існавалі калісьці, але былі разбураны.

«Расіяне гатовы — і ў Піцеры, і ў Ленінградскай вобласці, губернатары малайцы, яны гатовы падставіць сваё плячо. Але нейкая цяганіна ідзе, мы не можам пашырыць гэта вузкае месца», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, гэтай работай гатовы заняцца і самі беларусы.

Прэзідэнт назваў перспектыўным выкарыстанне чыгункі ў напрамку Паўночна-Заходняга рэгіёна Расіі для далейшай перавалкі грузаў праз расійскую партовую інфраструктуру. «Тут можам загрузіць і гандляваць, як бы нас ні палохалі», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, розных запалохванняў, у тым ліку да арышту суднаў і грузаў пры праходжанні па Балтыцы, баяцца не трэба. А калі трэба будзе, то судны будуць суправаджацца ваеннымі караблямі. «А як інакш? Мы не павінны ўвесь час — па адной шчацэ ўдарылі, другую падстаўляць. Не, мы так не будзем», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу, што нашы «сябры» ў краінах Балтыі, Швецыі, Фінляндыі пастаянна правакуюць беларусаў і расіян, каб потым выступіць з абвінавачаннямі. Але правакацыі ідуць, а фактаў няма. У прыклад беларускі лідар прывёў абвінавачанні ў падрыве «Паўночных патокаў». «Цяпер ужо зразумела, хто ўзарваў. Амерыканцы просяць кіраўніцтва ваша: «Аддайце нам іх (гэтыя газаправоды), мы будзем Еўропе пастаўляць ваш газ». Моцна трэба падумаць. Калі гэта так, вы ж ведаеце, па якім кошце амерыканцы купяць газ тут і паставяць туды», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Ён згодны з Прэзідэнтам Расіі па гэтым пытанні: каб Расія прадаўжала кіраваць «Паўночнымі патокамі», захоўваючы гатоўнасць супрацоўнічаць з ЗША ў гэтым праекце, калі будзе дамоўленасць з іншымі партнёрамі.

## «МЫ НЕ ПАВІННЫ СТРАЦІЦЬ НАШУ ВЯЛІКУЮ ПЕРАМОГУ»

Яшчэ адна тэма, на якую звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка, — захаванне памяці аб Вялікай Айчыннай вайне. Ён падзякаваў расіянам за тую вялікую работу, якую яны праводзяць у гэтым кірунку. «Мы ніколі ад гэтага не адыходзілі. Гэта наша адзінства. Гэта наша Перамога. Гэта наш гонар. Чаму мы павінны ўсё гэта з гісторыі выкідваць? Чаму? Нашы продкі перамаглі. Гэта добры, годны прыклад. Мы гэтым ганарыцца павінны. Я гэта кажу да таго, што без Расіі мы б гэта не ўтрымалі. А цяпер мы ідзём адзіным строем. Мы ўпэўнены, што не павінны страціць нашу Вялікую Перамогу», — заявіў беларускі лідар. Па яго словах, і ў Беларусі шмат для гэтага робіцца.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Валянціне Матвіенка за праект «Цягнік Памяці», які вельмі папулярны ў моладзі. Беларускі лідар заўважыў, што актыўна адраджаюцца помнікі. За кошт бюджэтных сродкаў Саюзнай дзяржавы створаны Ржэўскі мемарыял Савецкаму салдату. У цяперашні час вядуцца работы ў мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой». Помнікі героям той вайны ёсць у кожнай беларускай вёсцы. І яны не проста ёсць — іх даглядаюць. Праводзіцца вялікая праца, каб знайсці кожнае пахаванне, расследуецца крымінальная справа аб генацыдзе беларускага народа.

> **«Што датычыцца 80-годдзя Перамогі, нашага агульнага руху ў гэтым кірунку, будзьце ўпэўнены: мы зрабілі і робім нямала. Мы ад гэтага не адступім», — заявіў беларускі лідар.**

## «ТРЭБА САМАСТОЙНА БУДАВАЦЬ СВАЁ ЖЫЦЦЁ І САМАСТОЙНА СПРАЎЛЯЦЦА З ВЫКЛІКАМІ»

«Наша з вамі гістарычная місія — зрабіць працэс беларуска-расійскай інтэграцыі незваротным. Мы гэты шлях пройдзем годна», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу, што ідзе змена пакаленняў. І тыя маладыя людзі, якія прыйшлі да кіравання Беларуссю, таксама павінны гэта разумець. Найперш таму, што Расія — галоўны рынак для Беларусі. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што будучая пяцігодка ў Беларусі — пяцігодка якасці, галоўная задача якой — дашліфаваць краіну. І перакінуў мосцік: «Нам трэба дашліфаваць нашы адносіны. Трэба стварыць так, каб беларусы, знаходзячыся на гэтым разломе, не глядзелі ў бок Захаду, налева-направа».

Па словах кіраўніка дзяржавы, сёння трэба самастойна будаваць сваё жыццё і самастойна спраўляцца з выклікамі. Нават такімі сур'ёзнымі, як канфлікт на Украіне. Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Прэзідэнту ЗША Дональду Трампу за яго намаганні па спыненні баявых дзеянняў. Але, звярнуў увагу ён, амерыканскі бок не прадставіў канкрэтных прапаноў. «Факты на стол. Мы іх павінны пабачыць, каб не шкодзілі нам», — заявіў ён.

Напрыклад, калі гаворка ідзе аб магчымасці вяртання заходніх кампаній, то тут таксама трэба ставіць на першае месца нацыянальныя інтарэсы. Як заўважыў Прэзідэнт, у цэлым такая магчымасць не выклікае апасенняў з пункту гледжання ўзрастання канкурэнцыі, паколькі і Беларусь, і Расія даўно працуюць у адкрытых рынкавых умовах, канкуруюць з іншымі кампаніямі. «Будзем разглядаць усе прапановы зыходзячы з сітуацыі на зямлі, гаворачы ваенной мовай. Нам гэта вытворчасць выгадная — возьмем», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы. А што датычыцца якіхнебудзь прэферэнцый, гэта пытанне будзе вырашацца станоўча толькі ў тым выпадку, калі Беларусь або Расія зацікаўлены ў нейкіх асаблівых, унікальных тэхналогіях.

У сувязі з гэтым беларускі лідар звярнуў увагу на палітыку ЗША па Украіне і рэдказямельных металах: «Прагаварыўся Дональд: «Мы будзем там капаць, гэта будзе на граніцы, і там будзе самая добрая абарона ад Расіі». А ў чым ён не мае рацыю? Мы што, будзем атакаваць кар'еры кампаній з Амерыкі, якія там будуць працаваць? Бачыце, якія ў іх замашкі. Таму нам трэба спакойна глядзець на ўсе іх прапановы».

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што яны яшчэ раз абмяркоўваюць з Уладзімірам Пуціным пытанні перагавораў з ЗША. «Я ўпэўнены, што ў амерыканцаў няма ніякага плана, ідзе зандзіраванне. Паглядзім, чаго яны хочуць», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, такая мадэль паводзін характэрна для Дональда Трампа і яго каманды — яны маніторац сітуацыю па ўсім свеце ў пошуках выгадных для сябе тэм і прапаноў». І пачынаецца: раніцай адна заява, увечары — другая, у абед — трэцяя, і адна супярэчыць другой. Паспрабуй тут разабраць. Таму нам трэба спакойна гэта ўспрымаць», — сказаў ён. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што расійскае кіраўніцтва так і робіць. Адрэагаваў ён і на бурленне ў СМІ: «Назіраем. Працуем на прыём, як чэкісты гавораць. Потым адкажам».

## «АД ВАС ШМАТ ЗАЛЕЖЫЦЬ НЕ ТОЛЬКІ Ў РАСІІ»

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў членам Савета Федэрацыі за моцнае парламенцкае ўзаемадзеянне. І асабіста Валянціне Матвіенка за падтрымку беларускага боку. «Дазвольце мне ад імя ўсіх сенатараў Расійскай Федэрацыі падзякаваць вам за аказаны нам гонар і за тое, што вы знайшлі час наведаць Савет Федэрацыі, за ваша яркае, бліскучае выступленне, якое літаральна было прасякнута стваральнасцю, адкрытасцю і сапраўдным беларуска-расійскім брацкім сяброўствам, — звярнулася ў сваю чаргу да беларускага лідара Валянціна Матвіенка. — У тым, што мы дабіліся такіх маштабных вынікаў узаемавыгаднага стратэгічнага партнёрства, у тым, што мы так упэўнена рухаемся ў стварэнні Саюзнай дзяржавы — у гэтым ключавая роля і ключавая заслуга Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Уладзіміравіча Пуціна і ваша асабістая, дарагі, паважаны Аляксандр Рыгоравіч. Менавіта вы стаялі каля вытокаў Саюзнай дзяржавы».

Ва ўрачыстай абстаноўцы Валянціна Матвіенка ўручыла Аляксандру Лукашэнку ганаровы знак «За заслугі ў развіцці парламентарызму», які з'яўляецца найвышэйшым ведамасным знакам адзнакі Савета Федэрацыі. Узнагароды Прэзідэнт удастоены за вялікі ўклад у стварэнне Саюзнай дзяржавы, умацаванне дружбы і супрацоўніцтва паміж народамі Расіі і Беларусі. Кіраўнік беларускай дзяржавы падзякаваў за ўзнагароду і, звяртаючыся да прысутных, сказаў: «Рабяты, не адступайце, толькі наперад! Ад вас шмат залежыць не толькі ў Расіі».

Валянціна Матвіенка нагадала, што 35 гадоў таму — у сакавіку 1990 года — Аляксандр Лукашэнка быў выбраны дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. «Было такое. І вельмі гэтым ганаруся. Калі б гэтага перыяду, як і іншых, не было ў маім жыцці, я б, можа, і не быў Прэзідэнтам. Самы галоўны мой перыяд у жыцці — дэпутацкая работа. Я бачыў усіх, я бачыў усё і я там навучыўся высокім тэхналогіям — палітычным, дыпламатычным і іншым — і як губка гэта ўсё ўбіраў. За той перыяд мне не сорамна», — адказаў Аляксандр Лукашэнка.

АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю

# «МЫ ВЫРАЗНА ПРЫТРЫМЛІВАЕМСЯ ТРЭНДУ НА МІР»

**Адной з традыцый візіту беларускага лідара ў Расію стала цікавасць, якую праяўляюць да яго расійскія журналісты, і якім Аляксандр Лукашэнка ніколі не адмаўляе ў інтэрв'ю. Пасля выступлення з трыбуны Савета Федэрацыі Прэзідэнт адказаў на пытанні Вольгі Скабеевай, журналісткі тэлеканала «Расія-1».**




## БУДЗЕМ ГЛЯДЗЕЦЬ НА КАНКРЭТНЫЯ ФАКТЫ І ПРЫМАЦЬ РАШЭННЕ

Самым вострым пытаннем стала спыненне канфлікту ва Украіне. Гэтымі днямі Уладзімір Пуцін у Крамлі сустракаўся са спецпасланнікам Прэзідэнта ЗША Стывам Уіткафам. Як паведамлялася, Украіна па выніках перагавораў з ЗША ў Джыдзе 11 сакавіка прыняла прапанову Вашынгтона спыніць агонь на 30 дзён з магчымасцю падаўжэння, калі на такі ж крок пагодзіцца Расія. Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін 13 сакавіка заявіў, што Масква «за» перамір'е, але «ёсць нюансы». Вольга Скабеева спытала, ці паспеў Аляксандр Лукашэнка абмеркаваць гэту сустрэчу і ў цэлым пытанні міру са сваім расійскім калегам.

«Я ўвогуле ведаю яго пазіцыю, і ўчора ён малайчына, нават больш сказаў, чым хацеў. І ў тым ліку пра гэтыя 30 дзён. Я ведаю яго галоўнае жаданне — трэба гэта ўсё спыніць. За мір! Перамір'е месячнае, гэта не навінка з боку амерыканцаў. У прынцыпе, так было заўжды», — адказаў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, Уладзімір Пуцін мае рацыю ў тым, што ставіць пытанне: што будуць рабіць ва Украіне гэтыя 30 дзён? Ён звярнуў увагу: пакуль ідуць размовы аб перамір'і, у гэты ж час у Жэшуве, у Польшчы, назапасілася пэўная колькасць зброі, боепрыпасаў. Амерыканцы знялі цяпер усякія забароны на гэта, аб чым абвясціў Дональд Трамп. «Вы што, будзеце шпігаваць зброяй, яшчэ наёмнікаў туды перакідаць на працягу 30 дзён? А потым пачнём ваяваць па-новаму? Яшчэ больш людзей загіне, невядома, што будзе. Таму шмат пытанняў», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка, дадаўшы сваё меркаванне, што амерыканцы не маюць дакладна акрэсленага плана. Ён адзначыў, што пакуль у размовах аб перамір'і няма канкрэтыкі. «І вось паездкі высокапастаўленых амерыканскіх спецпасланнікаў, прадстаўнікоў гавораць аб тым, што яны намацваюць глебу, узгадняючы некаторыя пытанні з Украінай, Расіяй і іншае, каб вымаляваць нейкі план дзеянняў. Гэта будзе няпроста», — дадаў ён.

«Вы падвох адчуваеце ці мірам пахне?» — удакладніла Вольга Скабеева. «Не. У іх не можа быць падвоху. Нічога, пакуль я кажу, няма, але пахне мірам. Я думаю, што сёлета нам удасца нешта зрабіць з гэтай вайной, спыніць яе», — адказаў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, гэта датычыцца не толькі Украіны, але і Палесціны, Блізкага Усходу. «Таму што і асабіста Дональд (Трамп. — **«Зв.»**) нобелеўскім лаўрэатам хоча стаць. Калі ласка! Мы яго прадставім. Абы толькі мір быў... Не, тут падвоху няма, але верыць нельга. Факты на стол! Будзем глядзець гэтыя канкрэтныя факты і прымаць рашэнне», — растлумачыў беларускі лідар.

## «НА ГЭТАЙ ЗАБАРЫКАДАВАНАЙ ГРАНІЦЫ ЁСЦЬ «ВОКНЫ», ПРАЗ ЯКІЯ МЫ СУПРАЦОЎНІЧАЕМ»

У той жа час, звярнула ўвагу Вольга Скабеева, самы абароненых ўчастак украінскай граніцы — беларускі. «Кажуць, Лукашэнка гатовы нападаць», — расказала яна заявы ўкраінскіх СМІ. «Дзякуй, што вы мне сказалі», — адказаў Прэзідэнт Беларусі. Ён заўважыў, што ўкраінцы ўмацавалі граніцу з Беларуссю так, што ўжо больш няма куды. «Замініравалі ўсё. Замініравалі, забарыкадавалі. Ну і потым, гэта не прапаганда, гэта фэйканосы, ідыёты. Каб ты ведала, на гэтай забарыкадаванай граніцы ёсць «вокны», праз якія мы супрацоўнічаем з украінцамі. Мы, расіяне і яны з намі. Абмен загінулымі, абмен ваеннапалоннымі, параненых сюды прывозяць, да нас, пад Гомелем», — расказаў кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт звярнуў увагу, што падчас нядаўняга абмену палоннымі аказалася, што медыцынскую дапамогу расійскім палонным аказалі ўкраінцы. Граніца жыве, падкрэсліў ён. Усё больш украінцаў працуюць з расіянамі праз Беларусь.

Па словах кіраўніка дзяржавы, граніца забарыкадавана вельмі моцна. Украінцы баяцца даўно, што беларусы ўвяжуцца ў гэтую авантуру — у вайну. «Але мы выразна прытрымліваемся трэнду на мір. І ў нас няма такіх планаў нападаць на Украіну цяпер. Гэта было б непрыстойна з нашага боку, — адказаў на гэта беларускі лідар. — Яны мяне папракаюць: «Чаму — суагрэсар, такі-сякі — з Беларусі зайшлі расіяне?». Па-першае, я шчыра прызнаўся, што мяне генштаб Расіі не інфармаваў пра гэта. Пасля вучэнняў выводзілі расіяне свае войскі, ім здаўся ва Уладзівасток шлях ці на Урал, за Урал праз Кіеў бліжэйшым. Ну дык задайце пытанне генералам, якія выводзілі, чаму ім гэты шлях падаўся бліжэйшым?» Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што, калі б ён ведаў аб такіх планах, то Украіне б не дапамагаў. Таму што Украіна ўжо да гэтага часу з намі была ў стане вайны — эканамічнай: яны ўвялі супраць нас санкцыі па ўсіх кірунках. «Ні амерыканцы, ні еўрапейцы не ўводзілі, а яны нас пачалі бамбіць. Збольшага і расіян таксама. Таму з чаго б я абараняў украінцаў? Не», — сказаў беларускі лідар.

## «МЫ НІКОЛІ НЕ ПЛАНАВАЛІ НІЯКАГА НАПАДУ НА ЕЎРОПУ. І ЯНЫ ГЭТА ЦУДОЎНА ВЕДАЮЦЬ»

Вольга Скабеева пацікавілася меркаваннем Аляксандра Лукашэнкі наконт таго, што Еўропа, у прыватнасці Германія, Францыя, заявіла, што праз пяць гадоў будзе вялікая вайна. І пра які мірны трэнд тут можа ісці гаворка? «Слухайце, можа, ім гэта трэба?! А я вам скажу, што ніякай вайны Пуцін і кіраўніцтва Расіі не плануе. І ніякай вайны праз пяць гадоў не будзе. Мы наеліся. На гэтым прыкладзе», — адказаў беларускі лідар. Ён заўважыў, што цяпер вайна і ў СМІ ідзе вельмі жорстка. І нікому вайна ўжо не патрэбна. У Беларусі і Расіі яе не падтрымаюць. «Навошта гэта нам трэба? Гэта ім трэба, каб напружваць сітуацыю. Можа быць, яны хочуць стварыць армію (трэба ж апраўдацца перад людзьмі) еўрапейскую? Калі Трамп сыдзе — НАТА няма! Трэба нешта рабіць. Ці мала што будзе? Але трэба людзям растлумачыць: 800 мільярдаў долараў і іншае... Таму трэба дымавая заслона ў сродках масавай інфармацыі, што мы збіраемся нападаць. Слухайце, калі б збіраліся, то я б сапраўды ведаў, таму што ўся аперацыя — паўтары тысячы граніца з прыбалтамі і палякамі — ішла б праз нас. У нас такіх планаў няма», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што, калі пачалі закрываць Балтыку для таго, каб Расія не магла там гандляваць, ён абмяркоўваў праблему па еўрапейцах з Уладзімірам Пуціным. «Я так жартам кажу: «Уладзімір Уладзіміравіч, давядзецца вайсковымі суднамі суправаджаць сухагрузы нашы». Мы пажартавалі, пасмяяліся і ўсё, — расказаў ён падрабязнасці той размовы. — А ўвогуле гэта рэальна. Калі яны нас паспрабуюць замкнуць, парушаючы міжнародныя правілы (мы ж не лезем на іх тэрыторыю), нам давядзецца тады сур'ёзна над гэтым думаць. І мы ніколі не планавалі ніякага нападу на Еўропу. І яны гэта цудоўна ведаюць».

Журналістка спаслалася на выданне «Гардыян», якое цытавала Аляксандра Лукашэнку, заяўляючы, што нібыта той пагражае Еўрасаюзу. «Вы сказалі: у перагаворным працэсе Расія — ЗША знаходзіцца лёс Еўропы. Трэба паслухаць Лукашэнку — ён пасылае сігнал. Які сігнал?» — спытала Вольга Скабеева.

«Вы ведаеце, яны не зусім дакладна мяне працытавалі. Я сказаў, што калі Расія і ЗША дамовяцца без Еўропы, то Еўропе будзе труба, выходзячы з той пазіцыі, якую сёння заняла адміністрацыя ЗША. А ў яе і падставы ёсць. Не толькі тое, што яны (еўрапейцы. — **«Зв.»**) умешваліся ў амерыканскія выбары і «бамбілі» гэтага Трампа. Яны ж усе (і палякі, і немцы, і французы, англічане ў тым ліку) падтрымлівалі Байдэна. Ну, добра, падтрымлівайце, гэта не забаронена. Але вы ж непрыстойна паводзілі сябе, вы асабіста абражалі Трампа і гэтак далей. Таму ў асабістым стаўленні ў Трампа чарвівасць такая ёсць. Эканамічна? Дык ён кажа: «Хлопцы, вы прадаяце ў нас гэта, гэта, гэта. Усё прадаяце, а нашы тавары не пускаеце». Там рахунак ёсць пэўны. І каб ураўнаважыць гандаль, ён уводзіць паступова пошліны, падаткі на граніцы. Гэта эканамічная аснова. Ваенныя? Ён кажа: «Хлопцы, я не буду так траціцца, як раней, і сваіх хлопцаў у НАТА адпраўляць. А калі праз 5 гадоў пачнецца вайна з Расіяй і Беларуссю? Нашы будуць гінуць? Я гэтага не хачу. Я забяру сваіх». Значыць, у ваенных адносінах праблема. І гэтыя падставы ў Дональда Трампа ёсць. Ён іх выказвае», — адказаў Аляксандр Лукашэнка. Зыходзячы з аналізу сітуацыі, ён параіў еўрапейскім уладам не прапагандай займацца, а падумаць над тым, што сказаў Прэзідэнт Беларусі. «Калі дамовяцца Амерыка з Расіяй, ім сапраўды будзе труба. Хана ім будзе, як у нас у Расіі і Беларусі гавораць. Таму яны б паслухалі і ўзялі галаву ў рукі (калі ў кагосьці ёсць такая магчымасць)», — дадаў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў і свае словы, сказаныя ў інтэрв'ю Марыа Наўфалу, аб тым, што будучыня Еўропы — з Расіяй. «Калі аб'ядналюцца Еўропа і Расія, ну тады смерць, тады ўжо труба будзе для амерыканцаў. Яны разумеюць гэта. І ў чым я не маю рацыі ў гэтых развагах? — запытаўся Прэзідэнт. — Таму гэта ўжо быў другі мой месендж, які я ім пасылаю. Калі дамовіцца Расія з Амерыкай — ім (еўрапейцам. — **«Зв.»**) труба. Каб амерыканцы з аднаго боку, расіяне — з другога не загналі іх у трубу (тую, якую Пуцін казаў), яны яе ўзарвалі. Ім трэба зараз сюды ісці і сказаць: «Хлопцы (не трэба на каленях, мы не хочам, каб яны тут поўзалі, і Пуцін гэтага не хоча), давайце размаўляць, давайце будзем дамаўляцца».

## «ДАВАЙ ПАЦІХУ НАШ СЛАВЯНСКІ СВЕТ БУДЗЕМ АДРАДЖАЦЬ»

Адказваючы на пытанне, хто дагавораздольны ў Еўропе, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што нікога дагавораздольнага і ва Украіне няма, але размовы вядуцца. «Трэба размаўляць з тымі, хто гэтага хоча. Ну, мы не бачым такога гарачага жадання размаўляць з намі, з Расіяй і гэтак далей. Я не буду гаварыць, няхай Уладзімір Уладзіміравіч скажа. Ён размаўляў з імі. Яны яму тэлефанавалі, ён размаўляў з некаторымі. Гэта не публічная была дамоўленасць, што яны будуць гаварыць, — расказаў Прэзідэнт. — Гэта пакуль закрытая інфармацыя, магчыма, з часам Уладзімір Пуцін раскажа падрабязней. Але няхай і ў закрытым рэжыме, але перагаворы ідуць».

Вольга Скабеева нагадала пра словы Аляксандра Лукашэнкі наконт лёсу Уладзіміра Зяленскага, якога беларускі лідар папярэджваў, што са зменай адміністрацыі ў Белым доме той стане нікому не патрэбны. «Яно аказалася так, што нават і замяніць яго хочуць, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Ну, гэта ўжо мяжа. Слухайце, я ўяўляю, што нехта публічна загадаў бы мне: «Так, здай паўнамоцтвы і сыходзь». Неверагодна! Краіну давёў да такой ступені, што ён сказаць нічога не можа. У Авальным кабінеце што ён дрэннага казаў? Ён правільна казаў. Але гэта не заходзіць людзям. Гэта расцанілі як, па-першае, яго недальнабачнасць, па-другое, слабасць, па-трэцяе, нявопытнасць. Ну, відаць было, журналісты не сышлі і іншае. Рабі высновы і будуй размову адпаведным чынам. Асабліва калі табе задаюць пытанне па тваёй спартыўнай майцы, у якой ты прыйшоў, ад сур'ёзных хлопцаў з гальштукамі і іншае. Гэта ж зразумела. Ты рабі выснову, што тут пастаноўка. Але, тым не менш, не зайшло. І прыйшлося яму прасіць прабачэння ні за што і згаджацца на тое, што прапанавалі гаспадары. Але гэта ж ён давёў да гэтага». Прэзідэнт паўтарыў свой месендж аб тым, што Беларусь,

Расія і Украіна павінны сесці ўтрох і дамовіцца. «Слухайце, усякае бывае, цяжкі выпадак (не проста морду набілі), але давай спынімся. Давай паціху наш славянскі свет будзем адраджаць», — дадаў ён.

«Вы яго па-рознаму — Зяленскага — называеце: то Валодзем, то, я памятаю, гнідай», — заўважыла Вольга Скабеева. «Валодзя як сын мне быў, а дзейнічаў як гніда. Як яго назваць? Я тады так і зваў. Гэта, мусіць, непрыгожа з майго боку. Але дакладна было. Так нельга рабіць. Што мне пра яго дрэннага сказаць? Я з ім быў у добрых адносінах. Я заўсёды яму расказваў, як разумеў гэты свет, раіў. Ну, вось ён, бачыш, як паслухаў мяне?! А калі б паслухаў, была б іншая сітуацыя», — адказаў на гэта Аляксандр Лукашэнка.

Журналістка спытала, ці прымуць Уладзіміра Зяленскага ў Беларусі, калі ён папросіць палітычнага прыстанішча. «Не, ён у мяне не папросіць. У яго няма асабнякоў і дач у Беларусі. Яны на Лазурным беразе, у Англіі, там, кажуць, замкі і іншае. Ён туды паедзе. Там яны ўжо атабарыліся. Ён сюды не паедзе», — сказаў беларускі лідар. У сувязі з гэтым ён згадаў выпадак з Міхаілам Саакашвілі ў свой час, якога прасілі забраць у Беларусь. Расійскі бок супраць не выступаў, а амерыканцы пальцам не паварушылі.

Вольга Скабеева на гэта заўважыла, што для Расіі Міхаіл Саакашвілі — ваенны злачынца. «Колькі іх, гэтых ваенных злачынцаў? Жыццё ідзе. Адпусцілі б яго чорт ведае куды. Мы ж абменьваем — расіяне і мы — сур'ёзных злачынцаў... Я памятаю, да смяротнага пакарання быў прысуджаны, мы яго адпусцілі. Сядзеў бы ён там, застрэлілі б яго. Ужо і забыліся, што б атрымалі? А так, можа, чалавек яшчэ там у Германіі ці ў Амерыцы будзе жыць. Сям'я, дзеці», — адзначыў беларускі лідар.

Прэзідэнт перакананы: трэба не тое што ўмець даравацы — трэба проста глядзець рэальна: навошта гэта? Калі гэта не трэба — не трэба гэта і рабіць.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што прэзідэнцкія выбары ва Украіне, пра якія цяпер шмат размоў, гэта ўнутраная справа ўкраінцаў. І педаляваць гэту тэму не варта. «Людзі самі разбяруцца. Там жа зразумела, што Уладзімір Аляксандравіч, Валодзя, ён не выйграе выбары. Навошта на гэтае балючае месца яшчэ ціснуць і за кошт гэтага свой аўтарытэт апускаць?» — лічыць беларускі лідар.

## «НЯМА РЭСУРСУ ДЛЯ ГЭТАЙ ВАЙНЫ»

Яшчэ адно вельмі гарачае пытанне — калі ў Беларусі будзе «Арэшнік»? Аляксандр Лукашэнка расказаў, што часта абмяркоўвае яго з Уладзімірам Пуціным. Пускавыя ўстаноўкі, асноўная база выпрацоўваецца ў Беларусі, таму гэта беларуская тэма, якую кантралюе Аляксандр Лукашэнка. «Мы да канца года, па-мойму, дзве ўстаноўкі ўжо на ўзбраенне гатовы паставіць. Такія ракеты ёсць, але ці варта гэтыя першыя (гэта не першыя, а тыя ракеты, якія зроблены, больш сучасныя) ставіць паблізу нашых ворагаў? Ці мы іх паставім недзе пад Масквой або яшчэ недзе на пазіцыі? Мы павінны вызначыць дакладна гэта месца і дамовіцца», — сказаў ён. Па словах Прэзідэнта, спешка тут непатрэбная. «Няма такой неабходнасці хутчэй заўтра недзе пад Оршай паставіць «Арэшнік». Трэба — паставім. Але гэта сур'ёзная зброя, яе на калене за паўгода ці за адзін месяц не зробіш», — удакладніў ён.

«Будзем спадзявацца тады на дээскалацыю, як вы сказалі, на мір ужо сёлета», — падвяла фінішную рысу інтэрв'ю Вольга Скабеева. «Я не проста спадзяюся. Нешта мне падказвае, што няма рэсурсу для гэтай вайны. Людзі стаміліся (мы бачым, што на фронце робіцца), стаміліся з аднаго і з другога боку, — адказаў на гэта кіраўнік дзяржавы. — Адчуваю, што, як я часта кажу, не дайшло б да таго, што пачнецца братанне на лініі фронту. Гэта ж нашы людзі. Яны абмяркоўваюць там бой нейкі і іншае. УСУшнікі і расіяне. Дэсантнікі, баевікі сапраўдныя абмяркоўваюць нейкі бой. І я ўжо недзе казаў пра гэта. Падкрэсліваем — лінія. Кажуць: «А што ж яны, гэтыя хахлы, так ваююць?». А другі расіянін кажа: «А што, ваююць? Гэта такія, як мы, кажа, адны акадэміі заканчвалі». Гэта значыць, яны з такім жа сэрцам і з такім нутром, як мы, упартыя. Таму гіне шмат людзей». Разам з тым у некаторых момантах, напрыклад, у аперацыі «Труба», расійскія людзі аказваюцца мацнейшымі. «Трэба прыдумаць такое! 15 кіламетраў і метр сорак (дыяметр трубы. — **«Зв.»**) яны прапаўзлі фактычна. І вялізная колькасць высадзіліся ў тыл. І так рэзультатыўна! Там больш за 600 чалавек. Самых падрыхтаваных. І яны атакавалі імгненна. І пабеглі перш за ўсё тыя, хто кіраваў БПЛА — дронамі, а гэта галоўная зброя сёння ва Украіне. А калі яны пабеглі, яны не бачылі, што робіцца: разведдроны, ударныя дроны не працуюць, яны першымі пабеглі. Вось табе інсайдарская інфармацыя. Яны першыя ўцяклі, калі ты не ведаеш. А следам ужо разведкі няма, таго няма. Вельмі моцны быў ход... І хлопцы робяць цуды, што з аднаго, што з другога боку. Яны ўручную вырабляюць такія дроны, якія ні на адным заводзе не вырабіш. Кулібіны! І ў нас, і ў іх», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

А скончыў інтэрв'ю Прэзідэнт Беларусі ёміста: «Таму трэба гэту справу (вайну. — **«Зв.»**) заканчваць».

---

**Могилевский филиал**
**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**(Организатор аукциона)**
**извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего**

**ОАО «Компания «МогНат»**
(Могилев, ул. Карла Маркса, 17)

**Торги состоятся 15.04.2025 в 11.00**
**на электронной торговой площадке GOSTORG.BY**

**Лот № 1: прицеп 2ПТС-4,** г. в. – 1986, р/з БЮ 9135, инв. № по бух. учету 3004, заводской № – б/н.

***Начальная цена продажи: 5 000,00 бел. руб. с учетом НДС.***
***Сумма задатка: 500,00 бел. руб.***

Р/с для перечисления задатка BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа 40901.

Срок внесения задатков и подачи документов для участия в торгах: по 14.04.2025 до 11.00.

Победитель торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения торгов в соответствии с выдаваемым счетом-фактурой. Порядок оформления участия в торгах, порядок их проведения, а также определения Победителя торгов, содержится в информации о проведении торгов, опубликованной на торговой площадке Организатора аукциона GOSTORG.BY. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее чем за три календарных дня до даты торгов.

Доп. информацию можно получить по тел. +37529-624-26-25, Mogilev@ino.by. Организатор торгов и оператор ЭТП: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.

Доп. информацию можно получить по тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25,** на сайте ЭТП **www.gostorg.by**

---

**Могилевский филиал**
**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества**

**ОАО «Могилевхимволокно»**

**Аукцион состоится 31.03.2025 в 11.00**
**по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352**

**Лот № 1 – изолированное помещение с инв. 700/D-148901 – гостиница,** пл. – 5392,8 кв. м, назначение: помещение, не относящееся к жилищному фонду. Капитальное строение с инв. № 700/С-75392 – внешняя канализационная сеть (протяж. 20 м). Капитальное строение с инв. № 700/С-75393 – внешняя водопроводная сеть (протяж. 12 м). В состав лота № 1 также входят основные средства и краткосрочные активы, список которых предоставляется по запросу. Изолированное помещение с инв. 700/D-148901 расположено по адресу: г. Могилев, пр-т Шмидта, 20-1 в кап. строении с инв. № 700/С-9494 – здание гостиницы (5618,4 кв. м, г. Могилев, пр-т Шмидта, 20). Капитальное строение с инв. № 700/С-9494 расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000005000021 (0,1597 га, целевое назначение земельного участка: для содержания и обслуживания здания гостиницы, право постоянного пользования). Отдельный земельный участок для обслуживания лота № 1 не выделен. Обременение: ипотека.

**Начальная цена продажи: 5 360 027,51 бел. руб. с учетом НДС.**
**Сумма задатка 536 002,75 бел. руб.**

Р/с для перечисления задатка BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа 40901.

Срок подачи документов для участия в аукционе: по 28.03.2025 до 11.00.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на торговой площадке Организатора аукциона GOSTORG.BY.

**Доп. информацию можно получить по тел. 8029-624-26-25, Mogilev@ino.by**

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие
**«Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор аукциона)
по поручению **ОАО «Веста-Борисов»** (продавец)
проводит открытый аукцион

**ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ МАГАЗИНА**
**с инв. № 610/С-10352 общей площадью 110,7 кв. м,**
**расположенного на земельном участке**
**с кадастровым номером 640400000001000174**
**площадью 0,0513 га**
**(право постоянного пользования)**
**по адресу: Минская область, г. Борисов,**
**ул. Красноармейская, 172Б.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 69 120,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 6 912,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB3012108260016 9330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона.

Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **18.04.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.04.2025** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 136-31-11, 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: 8 (0177) 74-44-65, 8 (029) 680-16-43.**

УНН 600012029

---

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ**
**В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**
по продаже имущества,
изъятого, арестованного или обращенного
в доход государства, организуемого
ККУП «Витебский областной центр маркетинга»

**Предмет торгов**

**Лот № 1.** 1/2 доля в праве собственности на объект недвижимости: недвижимое улучшение – капитальное строение с инв. № 235/С-3694, площадь 55,4 кв. м, назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом, расположенное на земельном участке с кадастровым № 225183012602000001.
Составные части и принадлежности: мансарда, подвал, баня, две калитки, трое ворот, два ограждения, артезианская скважина, теплица, бассейн, пять площадок. Имущество расположено по адресу: Витебская обл., Чашникский район, Лукомльский с/с, д. Торопы, ул. Озёрная, 18.

Характеристики лота № 1. Кап. строение имеет подвальный этаж, 1-й и 2-й этажи, мансардный этаж. Целевое назначение зем. участка: для строительства и обслуживания жилого дома. Назначение зем. участка в соответствии с единой классификацией объектов недвижимого имущества: зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Зем. участок предоставлен на праве общего долевого пожизненного наследуемого владения (доля – 1/2). Общая площадь всего участка: 0,2274 га. Ограничения (обременения) прав на зем. участок: ограничение (обременения) прав в использовании земель, находящихся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос (озеро Лукомльское), ограничения (обременения) прав в использовании земель, находящихся в охранных зонах линий электропередачи напряжением до 1000В. Сведения об ограничениях (обременениях) прав на соответствующее имущество (кап. строение с инв. № 235/С-3694): арест 1/2 доли установлен постановлением о наложении ареста на имущества от 18.10.2010 б/н (арест снимается по решению суда после полной оплаты стоимости приобретенного имущества). Возможно выделение доли в праве собственности на объект недвижимости в натуре. Рядом озеро Лукомльское.

**Начальная цена продажи имущества:**
**25002 белорусских рубля и 00 копеек.**
**Размер задатка: 2500 белорусских рублей 20 копеек.**

**Условия:**

1. Участник аукциона, выигравший торги, единственный участник, который приобрел недвижимое имущество по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов (далее – Победитель аукциона), обязан: возместить Организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения на основании счета-фактуры в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе предмета торгов не позднее 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. Указанный срок перечисления денежных средств победителем аукциона может быть на основании его письменного ходатайства однократно продлен Управлением по Витебской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь, но не более чем на 20 рабочих дней. Оплата стоимости приобретенного на аукционе недвижимого имущества иностранными физическими и юридическими лицами осуществляется в установленном порядке за белорусские рубли или за иностранную валюту по официальному курсу белорусского рубля по отношению к иностранной валюте, установленному Национальным банком на дату платежа в соответствии с валютным законодательством.
2. Оформление документов и переход права собственности на приобретенный на аукционе предмет торгов осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
3. На Победителя аукциона распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Организатор аукциона:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 24-63-12, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by. Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63.

Для участия в аукционе приглашаются резиденты РБ и нерезиденты РБ, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток, предоставили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона с ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона www.marketvit.by.

**Задаток перечисляется** на р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901, получатель платежа: ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Повторный аукцион состоится 31.03.2025 в 15.00** по адресу: 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок подачи заявления и документов: с **17.03.2025** в рабочие дни с 08.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» (каб. № 4).

Последний срок подачи заявления и прилагаемых к нему документов **28.03.2025 до 15.00.**

Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 09.02.2024, 06.04.2024, 23.11.2024, 15.03.2025.

Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона письменно доводится до сведения участников перед началом проведения аукциона. Всем участникам предоставляется право ознакомления с имеющейся документацией на предмет торгов, а также возможность осмотра предмета торгов на местности.

**Телефоны для справок: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63**

---

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
информирует о проведении электронных торгов
по продаже имущества, принадлежащего
**Кривосельскому сельскому исполнительному комитету** (Продавец)
на праве оперативного управления.

Электронные торги состоятся **16.04.2025**

**Лот № 1: LADA 21214 010-40,**
кузов (рама) № XTA212140G2243654.

Начальная цена без учета НДС – 15 000,00 руб.

**Местонахождение:** Минская обл., Вилейский р-н, аг. Кривое Село, ул. Первомайская, 10.

Извещение о проведении электронных торгов размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу gki.gov.by, Минского областного исполнительного комитета minsk-region.gov.by, электронной торговой площадке «GOSTORG» gostorg.by.

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by. Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182

НА КАНТРОЛІ

# «ГЭТА СУЧАСНАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА, ЯКОЕ ПРАЦУЕ НА ПЕРСПЕКТЫВУ»

## Наталля КАЧАНАВА наведала Наваполацкі завод тэхналагічных металаканструкцый

**Старшыня Савета Рэспублікі падрабязна азнаёмілася з работай прадпрыемства. Маршрут наведвання ўчасткаў быў пабудаваны ў адпаведнасці з працэсам вытворчасці. Дырэктар прадпрыемства Іван Цішчанка праінфармаваў спікера аб дзейнасці завода, а таксама яго рэканструкцыі, праектах, якія рэалізоўваюцца і будуць рэалізоўвацца. Наталля Качанава пагутарыла з працоўным калектывам. Падчас рабочай паездкі ў Наваполацк таксама адбылася сустрэча са старшынёй Фарынаўскага сельскага Савета дэпутатаў.**



«Дзейнасць гэтага прадпрыемства я адсочвала на працягу многіх гадоў, яшчэ калі яны выкупілі тыя памяшканні, якія былі пустымі, — кажучы аб заводзе тэхналагічных металаканструкцый, праінфармавала Старшыня Савета Рэспублікі. — Я тады яшчэ працавала на полацкай зямлі, неаднаразова сустракалася з кіраўніцтвам прадпрыемства. Але тое, што я ўбачыла сёння, заслугоўвае самых добрых слоў. Перш за ўсё гэта тыя ўмовы, якія тут створаны. Гэта выпуск выдатнай канкурэнтаздольнай прадукцыі, якая пастаўляецца ў тым ліку практычна ва ўсе рэгіёны Расійскай Федэрацыі. Гэта перспектывы развіцця прадпрыемства, бо тут будуць рэалізаваны яшчэ два праекты, якія дазволяць выконваць ацынкавальныя работы, пашырыць магутнасці і асартымент прадукцыі».

Па словах спікера, на прадпрыемстве вельмі добры калектыў. «Яго колькасць прырастае, — адзначыла Наталля Качанава. — Тут добры канструктарскі аддзел. Гэта значыць, мазгавы цэнтр, які робіць усё для таго, каб прадукцыя, якая выпускаецца, была і канкурэнтаздольнай, і разам з тым сучаснай і запатрабаванай. Вельмі важна, што створаны добрыя ўмовы для людзей. Усё гэта рэалізацыя ў жыцці праекта, аб якім заўсёды кажа Прэзідэнт, — «Адзін раён — адзін праект». Гэта дазваляе людзям тут працаваць і мець годны заробак. Гэта сучаснае прадпрыемства, якое працуе на перспектыву. Кіраўніцтва прадпрыемства клапоціцца аб людзях, і людзі гэта шануюць».

Наталля Качанава сустрэлася з калектывам прадпрыемства. Размова атрымалася насычанай. Старшыня Савета Рэспублікі расказала аб палітыцы, якая праводзіцца ў дзяржаве, расследаванні крымінальнай справы аб генацыдзе беларускага народа, нязменнай пазіцыі кіраўніка дзяржавы ў пытанні захавання міру на беларускай зямлі, рабоце эканамічнага блока, а таксама павіншавала супрацоўнікаў з надыходзячым дзяржаўным святам — Днём Канстытуцыі.

«За мінулы год у Віцебскай вобласці выкананы ўсе прагнозныя паказчыкі сацыяльна эканамічнага развіцця, — праінфармавала спікер. — Вобласць — на другім месцы пасля Мінска. Гэта ўнёсак усіх, хто працуе ў Віцебскай вобласці».

Наталля Качанава адзначыла, што за 30 гадоў у нашай краіне аб'ём прамысловай вытворчасці павялічыўся ў чатыры разы, рэальныя грашовыя даходы насельніцтва — у дзесяць разоў, пенсіі — больш як у 14 разоў. Працягласць дарог з удасканаленым пакрыццём павялічылася ў два разы.

«З нашай краінай, самастойнай, суверэннай і незалежнай, сёння на міжнароднай арэне лічацца, нас паважаюць, — акцэнтавала ўвагу спікер. — Палітыка, якая праводзіцца ў нашай краіне, — гэта перш за ўсё людзі і іх дабрабыт. Знешняя палітыка — гэта толькі мір і згода».

Звяртаючыся да калектыву, Наталля Качанава заўважыла, што беларусы зрабілі абсалютна правільны выбар 26 студзеня 2025 года, калі прыйшлі на выбарчыя ўчасткі і выбралі лідара сваёй краіны. «Ад кіраўніцтва краіны залежыць вельмі шмат, — падкрэсліла яна. — Наш Прэзідэнт працуе ў імя народа і на карысць народа. Мы павінны рабіць усё, каб захаваць мір, стабільнасць і спакой. А для гэтага мы павінны быць адзіныя. Прэзідэнт даў мясцовым органам улады яшчэ больш паўнамоцтваў. Я лічу, што ад гэтых людзей залежыць практычна ўсё, бо сама была старшынёй Наваполацкага гарвыканкама, намеснікам старшыні Полацкага гарвыканкама. У пяцігодку якасці мы павінны зрабіць усё, каб наша прадукцыя і нашы тавары былі запатрабаваны».

У час рабочай паездкі Наталля Качанава таксама наведала Фарынаўскі сельсавет і азнаёмілася з яго дзейнасцю.

«Мы — орган тэрытарыяльнага прадстаўніцтва, каардынуем работу дэпутацкага корпуса ўсёй краіны, — нагадала Старшыня Савета Рэспублікі. — Таму асаблівую ўвагу ў сваёй рабоце ўдзяляем нашым калегам на месцах. Перш за ўсё гэта сельскія Саветы. Вы ведаеце, якое значэнне надаецца рэгіянальнаму развіццю нашай краіны, фарміраванню моцных рэгіёнаў. Ад работы сельскіх Саветаў залежыць многае, таму для нас вельмі важны гэты кірунак работы. Мы ўзялі сабе за правіла пры выездзе ў рэгіёны абавязкова наведваць сельскія Саветы, глядзець, як працуюць гандлёвыя аб'екты, установы аховы здароўя, установы культуры. Для нас важна, каб у кожным рэгіёне нашай краіны было выканана даручэнне Прэзідэнта: каб людзі адчувалі сябе камфортна і маглі мець усе магчымасці для самарэалізацыі».

**Паводле БелТА і прэс-службы Савета Рэспублікі. Фота БелТА.**

АКТУАЛЬНА

# «ТОЕ, ШТО ПЛАНУЕМ, МЫ ПАВІННЫ ВЫКАНАЦЬ»

## Аляксандр ТУРЧЫН: праграму сацэканамразвіцця трэба будаваць з рэальна дасягальных мэт

**Падрыхтоўку канцэпцыі праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2026—2030 гады абмеркавалі ўчора на нарадзе ў прэм'ер-міністра, паведамілі ў прэс-службе ўрада.**

Прэм'ер-міністр таксама адзначыў, што пры падрыхтоўцы дакумента неабходна ўлічыць запыт грамадства, што яно хоча бачыць ад дзяржавы ў будучай пяцігодцы. Для гэтага ў найбліжэйшы час неабходна правесці маштабнае сацыялагічнае даследаванне.

— Каб мы будавалі праграму з рэальна дасягальных мэт. Тое, што плануем, мы павінны выканаць, — сказаў на заканчэнне ён.


**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Гродногазстройизоляция»**

**Аукцион состоится 15.04.2025 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | **Лот № 1: грузопассажирский вагон GAZ 2705, 2013 г. в.,** регистрационный знак AI 0763-4, допустимая полная масса 3500 кг, свидетельство о регистрации САА 386083, дата выдачи 26.06.2013, номер кузова (рамы) X96270500D0752440, пробег – 325 677 км. Местонахождение автомобиля: Брестская область, г. Ивацевичи, 40 лет Октября, 3 |
| **Начальная цена продажи** | **ЛОТ № 1** – 8 160 руб. (восемь тысяч сто шестьдесят рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | **ЛОТ № 1** – 816 руб. (восемьсот шестнадцать рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений – **11.04.2025 г. до 15.00** |

Условия проведения аукциона:
1. Возмещение Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи.
2. Возмещение Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на оказание услуг по независимой оценке объекта продажи в размере 249,78 руб. с НДС за оценку 1 единицы техники.
3. Возмещение Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на оказание услуг по проведению аукциона согласно акту сдачи-выполненных работ от 14.02.2025 № 1 и протокола несостоявшегося аукциона от 14.02.2025 № 1 в размере 524,51 бел. руб. с НДС

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony



**20 марта 2025 г. в 9.30**

*по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, д. 16, комн. 1*

**СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

**ЗАО «Возвышенность»**

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2024 г.
2. Утверждение отчета Наблюдательного совета за 2024 г.
3. Отчет Ревизора за 2024 г.
4. Утверждение годовой бухгалтерской отчетности, счетов прибыли и убытков, распределение прибыли и убытков Общества за 2024 г.
5. Избрание членов Наблюдательного совета на 2025 год.
6. Избрание Ревизора Общества на 2025 год.

С документами, относящимися к повестке дня, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, д. 16, комн. 1 с 09.00 до 18.00 ежедневно, кроме субботы, воскресенья и праздничных дней с предварительным телефонным уведомлением.

Форма проведения собрания: очная. Форма голосования по всем вопросам повестки дня: прямая, открытая, карточками, изготовленными из бумаги с указанием количества голосов.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в Общем собрании участников Общества, будет проводиться с 8.40 до 9.25 в день и по месту проведения собрания.

При регистрации участники обязаны предъявить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Представители участников обязаны при регистрации предъявить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а также доверенность, удостоверенную в установленном законодательством порядке.

***ЗАО «Возвышенность», г. Минск, пр-т Независимости, 16, комн. 1.***

УНП 100088694



**ЗАО «Центр промышленной оценки»** (УНП 191021390) извещает о проведении повторных электронных торгов в форме открытого аукциона

по продаже **автомобиля (suv universal) GEELY EMGRAND X7, р/зн. 5-НЕ Т 9369.**

(местонахождение: Минская область, г. Логойск, ул. Советская, д. 15).
**Начальная цена без НДС – 8 720,00 бел. руб.** (снижена на 20 %).

Продавец имущества: Логойский районный исполнительный комитет.
**Оператор ЭТП:** ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1 **(www.ipmtorgi.by)**

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 31.03.2025.**
**Дата и время окончания приема заявок:** по **28.03.2025** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайтах Государственного комитета по имуществу и Минского облисполкома



ОАО «Сантехэлектромонтаж» доводит до сведения акционеров общества, что 28.02.2025 г. годовым общим собранием акционеров по всем вопросам повестки дня решение принято. УНП 400052115

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# ДАДАТКОВЫЯ БАР'ЕРЫ І ЗДАРОВАЯ АБСТАНОЎКА

## У Палаце прадстаўнікоў абмеркавалі асобныя палажэнні праекта Закона «Аб змяненні законаў па пытаннях забеспячэння правоў дзяцей»

Законапраект ужо разгледжаны дэпутатамі ў першым чытанні, аднак шэраг новаўвядзенняў патрабуе сур'ёзнага ўдасканалення, каб на практыцы ні ў педагагічнай супольнасці, ні ў дзяцей і іх бацькоў не ўзнікала пытанняў, а тым больш праблем. Якія заканадаўчыя крокі яшчэ неабходна зрабіць, каб абараніць дзяцей ад псіхалагічнага і фізічнага ўздзеяння, абмеркавалі падчас рабочай нарады з удзелам парламентарыяў, прадстаўнікоў Міністэрства адукацыі, іншых зацікаўленых органаў.



**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА** праінфармаваў аб канцэптуальна новых палажэннях, прадугледжаных законапраектам. «Пазбаўленне права займацца педагагічнай дзейнасцю асоб, якія ўчынілі злачынствы экстрэмісцкай накіраванасці і злачынствы, звязаныя з незаконным абаротам наркотыкаў, — канкрэтызаваў ён. — Устанаўленне абавязку бацькоў забяспечваць абарону дзяцей ад інфармацыі, якая прычыняе шкоду іх здароўю і развіццю, у тым ліку праз кантроль за выкарыстаннем дзецьмі рэсурсаў глабальнай камп'ютарнай сеткі інтэрнэт і прымянення праграмна-апаратных, праграмных сродкаў, якія дазваляюць не дапусціць распаўсюджвання сярод дзяцей такой інфармацыі».

Акрамя таго, па словах спікера, прапануецца аднесенне да інфармацыйнай прадукцыі цацак, якія з'яўляюцца адлюстраваннем герояў камп'ютарных гульняў і фільмаў, для прысвоення ім знака ўзроставай катэгорыі. Прадугледжана замацаванне прававых гарантый забеспячэння дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, а таксама асоб з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, медыцынскімі вырабамі (вырабамі медыцынскага прызначэння, медыцынскай тэхнікай), у тым ліку акулярамі.

Падрабязна падчас нарады разгледзелі прапановы, што датычацца парадку правядзення псіхалагічнага сумоўя грамадзян, якія прэтэндуюць на ажыццяўленне педагагічнай дзейнасці. Менавіта гэта палажэнне законапраекта, як акцэнтаваў увагу Ігар Сергяенка, выклікала найбольш жывую цікавасць і ў дэпутацкім корпусе ў ходзе разгляду на першым пасяджэнні, і сярод педагагічнай грамадскасці. Пры гэтым спікер заўважыў, што педагогі яшчэ недастаткова азнаёмлены з гэтай тэмай.

«Пры прадстаўленні праекта ў Авальнай зале Андрэй Іванавіч (Іванец, міністр адукацыі. — **«Зв.»**) асабліва адзначыў, што законапраект накіраваны на дадатковую абарону дзяцей ад магчымых злачынных замахаў, — нагадаў Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — У першую чаргу, з дапамогай замацавання абавязку праходжання асобамі, якія прэтэндуюць на занятак педагагічнай дзейнасцю, псіхалагічнага сумоўя ў парадку, які будзе вызначаны ўрадам. Безумоўна, праект прымаўся з разуменнем таго, што да другога чытання ён будзе дапрацаваны, перш за ўсё ў часткі замацавання дакладнага, зразумелага ўсім парадку правядзення псіхалагічнай гутаркі. Меркавалася вызначыць кола асоб, якія падлягаюць сумоўю, перыядычнасць праходжання такога сумоўя, а таксама ўстанавіць магчымасць абскарджання яго вынікаў».

Ігар Сергяенка адзначыў, што ў працэсе работы над законапраектам, у тым ліку ў ходзе пасяджэння рабочай групы, дэпутаты не змаглі атрымаць адказаў на пастаўленыя пытанні. «Пры гэтым мы бачым, што нашы калегі з улікам меркаванняў педагогаў на месцах занепакоены тым, што ўвядзенне псіхалагічнага сумоўя не прынясе чаканага выніку, не дазволіць выявіць на ранняй стадыі патэнцыяльных асоб, схільных да здзяйснення злачынных дзеянняў, — патлумачыў спікер. — З іншага боку, можа выклікаць пэўную напружанасць сярод работнікаў сферы адукацыі. Таму нам трэба абавязкова вызначыць падыход: як неабходна адлюстраваць у законапраекце і ці будзе эфект ад новаўвядзення, якое прапаноўваецца. Сумеснымі намаганнямі мы павінны выпрацаваць такі прававы парадак, які дазволіць стварыць дадатковыя бар'еры па абароне непаўналетніх ад супрацьпраўных замахаў і пры гэтым захаваць здаровую абстаноўку ў калектывах».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

МІЖНАРОДНЫ ВЕКТАР

# «НАША ЗАДАЧА — ПАМНАЖАЦЬ СЯБРОЎСКІЯ СУВЯЗІ ПАМІЖ НАРОДАМІ»

## Ігар СЕРГЯЕНКА правёў сустрэчу з паслом Узбекістана

Старшыня Палаты прадстаўнікоў адзначыў, што Беларусь надае найважнейшае значэнне ўмацаванню і далейшаму развіццю адносін з Узбекістанам. У аснове двухбаковага супрацоўніцтва, як падкрэсліў спікер, заўсёды былі і застаюцца сяброўства і ўзаемапаразуменне.

«Плённа развіваецца дыялог на найвышэйшым узроўні, — канстатаваў Ігар Сергяенка. — Высока ацэньваем візіт кіраўніка нашай дзяржавы ва Узбекістан у лютым мінулага года. Гэта дало дадатковы імпульс і штуршок для развіцця нашых адносін. Кантакты на найвышэйшым палітычным узроўні сур'ёзна стымулююць і развіццё эканамічных адносін».

Важным складнікам эканамічных адносін з'яўляюцца міжрэгіянальныя сувязі. «Летась у лютым прайшоў другі Форум рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана, — нагадаў Ігар Сергяенка. — Упэўнены, што ўмацаванне супрацоўніцтва паміж абласцямі Беларусі і Узбекістана будзе на карысць у вырашэнні рэгіянальных пытанняў. Мы, парламентарыі, у сваю чаргу, гатовы падключыцца да гэтай работы».

Кажучы ў цэлым аб міжпарламенцкіх кантактах, Старшыня Палаты прадстаўнікоў канстатаваў, што яны становяцца ўсё больш рэгулярнымі.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў нагадаў, што ў парламентах абедзвюх краін створаны групы дружбы. Спікер перакананы, што яны павінны больш актыўна працаваць: уносіць свой уклад у заканадаўчае суправаджэнне праектаў, якія рэалізуюцца, кантраляваць іх ажыццяўленне.

«Наша задача — на заканадаўчым, дыпламатычным узроўнях і надалей памнажаць сяброўскія сувязі паміж народамі, падтрымліваць станоўчыя тэндэнцыі, якія ў апошнія гады ўсё больш яскрава праяўляюцца ў двухбаковых адносінах», — рэзюмаваў Ігар Сергяенка, падкрэсліўшы, што беларускія парламентарыі заўсёды будуць рады бачыць узбекскіх сяброў на нашай гасцціннай зямлі.



У сваю чаргу **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Узбекістан у Рэспубліцы Беларусь Рахматула НАЗАРАЎ** адзначыў: «На ўсіх пляцоўках мы падтрымліваем шчыльныя, добрыя адносіны. З кожным годам умацоўваецца палітычны дыялог паміж нашымі краінамі. Усё дзякуючы таму, што ўстаноўлены сяброўскія, вельмі блізкія, добрыя кантакты паміж нашымі лідарамі.

**Вераніка КАНЮТА. Фота БелТА.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ООО «Химтэкинвест»** (организатор торгов) извещает о проведении открытого аукциона на повышение начальной цены по продаже

**автомобиля «Мицубиси Паджеро»,**
1997 г., техпаспорт № ВКА028471,
регистрационный номер 0594АО2,
тип кузова: легковой джип, 3-дверный,
тип двигателя: бензин, цвет: зеленый, руль: правый,
VIN или номер кузова: JMB0NV250WJ000107.

Данный лот находится в обременении по договору аренды до 31.12.2029 г., наложен запрет на совершение регистрационных действий.

Собственник: ООО «ТП Витамин», УНП 300517881, адрес: 211441, Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Молодежная, д. 11а, оф. 2. Тел.: 80214 500188, +375339033614.

Начальная цена – 6000 рублей.
Сумма задатка – 300 рублей.
Шаг торгов – 300 рублей.
Цена без НДС (НДС сверху не начисляется п. 2.30.2 ст. 115 НК РБ).
Начало подачи заявок – 20 марта 2025 года – 09.00.
Окончание подачи заявок – 21 апреля 2025 года 09.00.

Заявки на участие в торгах принимаются по адресу: 211443, Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Молодежная, д. 11А, пом. 20.

Организатор торгов – ООО «Химтэкинвест», УНП 191685984. При необходимости ознакомиться с документами и предметом аукциона, направлять запрос на электронную почту producomob2016@mail.ru или по тел. 8 (033) 9033614 (номер организатора торгов).

**Начало торгов: 23 апреля 2025 года в 9.00**
**по адресу: г. Новополоцк ул. Молодежная, 11А, комн. 20.**

Торги проводятся при наличии двух и более допущенных к торгам участников. Победителем торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот. К участию в торгах допускаются физические и юридические лица, подписавшие соглашение до начала торгов об ознакомлении с предметом торгов и копиями договора аренды; зарегистрированные в журнале регистрации заявлений; предоставившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах, копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей; доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет руководитель); копию платежного поручения (квитанции) о внесении задатка, заверенную банком. Физическим лицам – предъявить паспорт, иной документ, подтверждающий личность.

Задаток перечисляется на р/с номер счета (IBAN): BY13SLAN3012420840000010000 в г. Минск, ЗАО БАНК ВТБ (БЕЛАРУСЬ), код банка (BIC): SLANBY22, УНП: 191685984, ООО «Химтэкинвест» до подачи заявки на участие в аукционе, назначение платежа: «Задаток за участие в торгах по автомобилю Мицубиси Паджеро».

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней после дня проведения торгов (физическим лицам – на карт-счет, указанный при регистрации; юридическим лицам, ИП – на расчетный счет).

Участнику, выигравшему торги, задаток не возвращается и учитывается в счет оплаты предмета торгов по договору купли-продажи. Победитель торгов (либо единственный участник, давший согласие на приобретение лота), т.е. покупатель, подписывает протокол по результатам торгов в день его проведения, и в обязательном порядке возмещает затраты на организацию и проведение торгов в размере **287,28 бел. руб.** в течение 5 (пяти) календарных дней после проведения торгов, а также обязан заключить договор купли-продажи с собственником предмета торгов в течение 2 рабочих дней после проведения аукциона. Срок оплаты предмета торгов: в соответствии с заключенным договором.

- при условии единовременной оплаты стоимости объекта долевого строительства расчет должен быть произведен дольщиком в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном органе. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа. По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости помещения;
- при условии оплаты стоимости объекта долевого строительства согласно графику платежей к договору создания объекта долевого строительства первоначальный взнос по жилому помещению составляет 50 % от стоимости объекта долевого строительства. Оплата первоначального взноса должна быть произведена дольщиком в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном органе. Оставшаяся сумма по договору оплачивается ежемесячно равными долями в соответствии с графиком платежей к договору создания объекта долевого строительства;
- при кредитовании оплата стоимости объекта долевого строительства производится единовременно в полном объеме стоимости объекта. Оплата должна быть произведена дольщиком в течение 25 (двадцати пяти) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном органе.

**В доме имеются помещения, не относящееся к жилищному фонду.**

**Гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальным предпринимателям и юридическим лицам для заключения договора создания объектов долевого строительства предлагается 28 помещений, не относящиеся к жилищному фонду, по цене за 1 кв. м, эквивалентной 1000 долларам США.**

**Условия оплаты:** 100 % оплата полной стоимости объекта долевого строительства в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента регистрации договора долевого строительства в местном исполнительном органе. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа. По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости помещения либо иные условия оплаты объекта долевого строительства.

**Характеристика объекта строительства:** объект долевого строительства – помещения, не относящиеся к жилищному фонду – кладовые расположенные в 5-й секции на 1-м нежилом этаже (отметка пола -5.700), с обособленным входом непосредственно с уровня земли дворовой территории объекта **«Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями на пересечении ул. Прилукской – ул. Глаголева – пр. Жукова в г. Минске» 3-я очередь строительства.**

Объект долевого строительства передается с черновой отделкой. Выполняется установка входных дверных блоков. Устройство чистового покрытия пола не выполняется; штукатурка, шпаклевка, окраска стен и потолков не выполняется. Электромонтажные работы: предусмотрена разводка сети освещения, монтаж и установка встроенной мебели не производится.

Все последующие работы по доведению помещений до полной готовности выполняются собственниками помещений за свой счет. Перечень работ, выполняемых дольщиком, определяется дольщиком по своему усмотрению с учетом требований законодательства Республики Беларусь Эксплуатационно-технического паспорта объекта строительства.

АНАЛІТЫКА

# ТРЭНД НА ПАЗІТЫЎ

## ЕАБР: беларуская эканоміка захоўвае высокія тэмпы росту



**Гэта вынікае з чарговага макраэканамічнага агляду, падрыхтаванага аналітыкамі Еўразійскага банка развіцця. Беларуская эканоміка захавала высокія тэмпы росту дзякуючы моцнай дынаміцы ў прамысловасці, будаўніцтве і гандлі. Унутраны попыт застаецца ключавым драйверам эканамічнай актыўнасці. Інфляцыя застаецца паблізу мэты. За кошт чаго — у нашым матэрыяле.**

### ДРАЙВЕРЫ РОСТУ

— Эканоміка ў 2024 годзе вырасла на 4 % пасля 3,9 % у папярэднім годзе, — звяртаюць увагу спецыялісты банка, вылучаючы ключавы драйвер — прамысловасць, дынаміка ў якой (+5,4 %) забяспечыла блізу 1,4 працэнтнага пункта прыросту ВУП.

На думку аналітыкаў, высокі попыт з боку Расіі выступіў асноўным фактарам павелічэння выпуску прадукцыі беларускай прамысловасці. Значную ролю ў пашырэнні эканамічнай актыўнасці адыгралі гандаль, аб'ём якога вырас на 8,1 %, і будаўніцтва (+9,8 %), забяспечыўшы каля 0,8 і 0,5 працэнтнага пункта прыросту ВУП адпаведна.

Яны звяртаюць увагу і на той факт, што аднавіўся рост у IT-сектары, які пэўны час раней меў адмоўную дынаміку:

— Дабаўленая вартасць у сектары інфармацыі і сувязі павысілася на 1,8 %.

Таксама спажывецкі попыт стаў важным фактарам узмацнення эканомікі ў 2024 годзе ў нашай краіне.

— Высокі рост рэальных даходаў ва ўмовах павышэння заробкаў выступіў ключавым фактарам павелічэння спажывання. Высокая крэдытная актыўнасць насельніцтва таксама падтрымала пашырэнне ўнутранага попыту, — гаворыцца ў аглядзе.

У прыватнасці, рознічны тавараабарот летась вырас на 11,8 % — шмат у чым за кошт гандлю нехарчовымі таварамі (+17,6 %), адлюстроўваючы павышэнне ўзроўню дабрабыту. Тавараабарот грамадскага харчавання павялічыўся на 10,6 %, а аб'ём платных паслуг насельніцтву — на 10 %.

Працягнула пашырацца і інвестыцыйная актыўнасць. Спецыялісты ЕАБР тлумачаць: рост капітальных укладанняў спрыялі меры ўрада Рэспублікі Беларусь, такія як зніжэнне падаткаў на абсталяванне, што ўвозіцца, і ўдасканаленне інвестыцыйнага заканадаўства.

Так, інвестыцыі ў асноўны капітал летась выраслі на 8 % — пасля павелічэння на 17,8 % у 2023-м, што дазволіла цалкам кампенсаваць скарачэнне інвестыцый у 2022 годзе.

— Прадпрыемствы актыўна інвеставалі ўласныя сродкі і прыцягвалі крэдыты для пашырэння вытворчасці. Сукупна гэтыя крыніцы фінансавання забяспечылі каля 90 % прыросту інвестыцый, — адзначаюць аналітыкі.

Спецыялісты банка звяртаюць увагу на яшчэ адзін пазітыўны трэнд: у пачатку гэтага года пашырэнне эканамічнай актыўнасці працягваецца:

— ВУП у студзені 2025 года павялічыўся на 3,7 % у гадавым выражэнні — пераважна за кошт сектараў, арыентаваных на спажывецкі попыт і будаўніцтва. Рознічны тавараабарот вырас на 12,2 % (год да года), аб'ём падрадных работ — на 10,3 %.

### ЗАРОБКІ РАСТУЦЬ, БЕСПРАЦОЎЕ ЗНІЖАЕЦЦА

Што датычыцца рэальнага заробку, то ў 2024-м ён вырас на 13 % у гадавым вылічэнні пасля росту на 11,6 % у 2023 годзе.

— Рост заробку ў бюджэтным сектары на 11 % стаў вынікам індэксацыі аплаты працы ўрадам. У пазабюджэтным сектары павышэнне заробкаў было абумоўлена дэфіцытам на рынку працы: колькасць вакансій за 2024 год дасягнула 3,9 % ад занятага насельніцтва. Пры гэтым узровень беспрацоўя знізіўся на 0,5 працэнтнага пункта — да 3 % — гістарычна мінімальнага значэння, — тлумачаць спецыялісты банка.

У пачатку гэтага года тэндэнцыя росту заробкаў захоўваецца:

— У студзені заробкі выраслі на 13,5 % (у гадавым выражэнні), гэта звязана з павышэннем базавай стаўкі аплаты працы і павелічэннем надбавак для асобных катэгорый бюджэтных работнікаў. З улікам будучага павышэння аплаты працы ў бюджэтным сектары чакаем далейшага росту заробкаў.

### НА ВАГУ ЗОЛАТА

Яшчэ адзін пазітыўны трэнд, на які звяртаюць увагу аналітыкі, — інфляцыя ў снежні 2024-га запаволілася да 5,2 % у гадавым выражэнні — з 5,8 % у снежні 2023-га (пры мэтавым параметры не вышэй за 6 %).

— Утрымліваць інфляцыю каля мэты дапамагала цэнавае рэгуляванне, а таксама павышэнне стаўкі па крэдыце авернайт на 0,5 працэнтнага пункта — да 11 %, — тлумачаць спецыялісты банка.

На іх думку, дзякуючы ўмеранаму росту цэн на працягу 2023—2024 гадоў інфляцыйныя чаканні насельніцтва знізіліся да 10,6 % у сярэднім за 2024 год (з 11,5 % годам раней).

— Зніжэнне інфляцыйных чаканняў будзе спрыяць далейшаму працэсу дэзінфляцыі ў бягучым годзе, — гаворыцца ў аглядзе.

Тут адзначаецца, што ў лютым інфляцыя павялічылася да 5,6 % пасля 5,2 % у студзені.

— Пашырэнне ўнутранага попыту і павышаная інфляцыя ў ключавога гандлёвага партнёра (Расіі) фарміруюць праінфляцыйныя рызыкі на прагнозным гарызонце, — тлумачаць аналітыкі ЕАБР.

Пазітыў выклікаюць і золатавалютныя рэзервы нашай краіны, якія дасягнулі пяцігадовага максімуму і працягнулі рост, павялічыўшыся на 795,1 мільёна долараў у 2024 годзе і дасягнуўшы 8,9 мільярда долараў на пачатак 2025-га.

— Асноўным фактарам стала падаражэнне золата — яго кошт вырас на 25,5 % за мінулы год. У студзені станоўчая дынаміка захавалася — рэзервы павялічыліся яшчэ на 410,6 мільёна долараў, дасягнуўшы 9,3 мільярда долараў. Гэта максімальны ўзровень за апошнія пяць гадоў, — канстатуюць у ЕАБР.

### А ЯК У ІХ?

**Як паводзіць сябе сусветная эканоміка ў сучасных рэаліях: у ацэнках галоўнага эканаміста ЕАБР Яўгена ВІНАКУРАВА.**

— Сусветная эканоміка павялічылася на 3,2 % у 2024 годзе. Гэтаму спрыяў упэўнены рост краін, што развіваюцца, — ён склаў 4,2 %. Ключавы ўклад унеслі найбуйнейшыя эканомікі гэтай групы: Індыя (+6,5 %), Інданезія (+5 %), Кітай (+5 %) і Бразілія (+3,7 %), — адзначае аналітык.

Эканоміка еўразоны вырасла летась на 0,7 %, галоўным чынам за кошт прыватнага і дзяржаўнага спажывання, тады як інвестыцыйная актыўнасць знізілася.

— Запаволенне інвестыцый шмат у чым звязана з ростам коштаў энергіі з сярэдзіны 2024 года — гэта аслабіла канкурэнтаздольнасць еўрапейскай прамысловасці. У выніку прамысловая вытворчасць у еўразоне скарацілася на 3 % за год, — канстатаваў галоўны эканаміст.

Ён адзначае, што сярод буйных індустрыяльных краін найбольшыя страты зафіксаваны ў Германіі, дзе спад вытворчасці ў прамысловасці працягваецца з 2020 года, а летась ён дасягнуў 4,6 %.

— Гэта рэкорднае зніжэнне за ўвесь перыяд знаходжання краіны ў еўразоне, — падкрэслівае аналітык.

На яго думку, дадатковыя рызыкі для эканомікі стварае магчымае павышэнне тарыфаў ЗША на еўрапейскі экспарт:

— Гэта ўзмацняе асцярогі з нагоды слабага росту і магчымай рэцэсіі ў 2025 годзе.

Актуальная тэма сусветнага парадку дня — гандлёвыя войны і дэглабалізацыя эканомікі.

На думку эксперта, увядзенне дадатковых гандлёвых абмежаванняў з боку ЗША можа значна змяніць умовы функцыянавання сусветнай эканомікі як у найбліжэйшай, так і ў доўгатэрміновай перспектыве.

— Мытныя пошліны, уведзеныя ЗША для шэрагу краін, і меры ў адказ фактычна будуць азначаць пачатак новых гандлёвых войнаў і ўзмацненне дэглабалізацыі. У выніку гэтага і напрамкі, і аб'ёмы гандлёвых патокаў зменяцца, што стане прычынай значных эканамічных страт — як для асобных краін, так і для свету ў цэлым.

Паводле ацэнкі спецыяліста, ужо абвешчаныя меры могуць прывесці да страты 0,3 — 0,5 працэнтных пункта прыросту глабальнага ВУП і запаволіць рост сусветнай эканомікі (да 3 % у гадавым выражэнні і ніжэй) у 2025 годзе.


## ООО «СпецРеализация»

**объявляет о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – ОДО «ОРБИУС»** (УНП 101258669, г. Минск, ул. Л. Беды, д. 11, корпус 1, комн. 106)

***Дата и время проведения торгов*: 16 апреля 2025 года**. Начало – 10.00.
Заявки принимаются с 15 марта 2025 года по 14 апреля 2025 года.
***Место проведения торгов:*** г. Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».
***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.
***Продавец:* ОДО «ОРБИУС» (УНП 101258669), в лице ликвидатора — директора ООО «Юридическое агентство «КлеверКонсалт» Колыско А.А.**

| № лота | Наименование лота | Начальная цена руб., с учетом НДС по ставке 20 % | Шаг торгов | Задаток |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение с инв. № 602/D-35830, расположенное по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, ул. Калинина, 15А-1, площадь 738,6 кв. м, назначение – производственное помещение, наименование – производственное помещение ((свидетельство (удостоверение) № 602/1663-20 о государственной регистрации)), принадлежит на праве собственности | 307 800,00 | 5 % | 2 % |
| | Сведение о земельном участке: кадастровый номер 624450100001002377, площадь – 1,1866 га, назначение – обслуживание производственных зданий и сооружений, ((свидетельство (удостоверение) № 602/1339-11539 о государственной регистрации)), 63/250 доли в праве собственности на земельный участок (право аренды) | | | |

**Для участия в торгах необходимо:**

1. в срок до 15.00 14 апреля 2025 года перечислить задаток по выбранному лоту в соответствии с заключенным с организатором торгов договором о задатке на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация»;

2. подать организатору торгов в срок с даты опубликования **до 15.00 14 апреля 2025 года** заявление на участие в торгах с приложением документов в соответствии с Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (ред. от 12.07.2013), заключить с организатором торгов договор о задатке, заключить с организатором торгов соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, заключить с организатором торгов соглашение об оплате вознаграждения организатора торгов (соглашение о выплате аукционного сбора). Формы документов необходимо предварительно запросить у Организатора аукциона. Место приема заявлений – г. Минск, ул. Нарочанская, д. 11-2, пом. 406; время: с 9.00 до 16.00 в рабочие дни. Направление документов почтовым отправлением с целью регистрации в качестве участника аукциона не допускается. Телефон для ознакомления и осмотра лота: +375296847176, Яскевич Дмитрий Васильевич в рабочие дни с 9.00 до 16.00;

3. в день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за три рабочих дня до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах за приобретаемый предмет торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случаях, если:
- заявление подано только одним участником или для участия в торгах явился только один участник;
- для участия в торгах не было подано ни одного заявления или ни один из участников не явился.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается единственному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов, единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета торгов по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов, а также выплатить вознаграждение организатору торгов (аукционный сбор) в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов, единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета торгов по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, в день проведения торгов обязан подписать протокол о результатах торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 10 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов, единственным участником несостоявшихся торгов, выразившим согласие на приобретение предмета торгов по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 15 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен ликвидационной комиссией (ликвидатором)

# ПАКУПНІК ПАД АБАРОНАЙ



## У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

Сусветны дзень абароны правоў спажыўцоў адзначаецца 15 сакавіка, і на еўразійскай прасторы сёлета ён праходзіць пад дэвізам «Спажывец у цэнтры ўвагі: ад балансу інтарэсаў да справядлівага вырашэння спрэчак».

— Ад таго, наколькі канструктыўна выбудаваны ўзаемаадносіны прадаўца ці выканаўцы паслуг са спажыўцом залежыць паспяховасць яго работы, — падкрэсліла спецыяліст. — Але тут важны баланс. Работа па абароне правоў спажыўцоў павінна выбудоўвацца так, каб не ствараць перашкод для развіцця бізнесу.

Калі разглядаць структуру зваротаў спажыўцоў, то з года ў год яна практычна не мяняецца, распавялі ў МАРГ. Летась лідзіравалі скаргі на гандаль (45 % зваротаў), ЖКГ (28 %), бытавыя паслугі (11 %). 9 % скаргаў прыпала на сферу платных паслуг, 3 % — на грамадскае харчаванне і яшчэ 4 % аб'яднаны фармулёўкай «іншыя пытанні».

— У вышэйназваных 45 % скаргаў на гандаль каля 60 % — гэта скаргі на інтэрнэт-гандаль, — адзначыла Іна Гаўрыльчык. Але звязана гэта ў значнай ступені менавіта з актыўным развіццём інтэрнэт-гандлю і вялікай колькасцю пакупнікоў інтэрнэт-пляцовак, патлумачыла яна.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## ЯК АБАРАНІЦЬ СВАЕ ПРАВЫ?

— У Беларусі выбудавана дакладная сістэма: хто, як і на якіх стадыях абараняе правы спажыўцоў, — падкрэсліла прадстаўнік МАРГ. — У дасудовым парадку гэта робяць дзяржаўныя органы па кампетэнцыі (у сферы аховы здароўя, турызму, транспарту і г. д.), а рэгулятарам і каардынатарам у гэтай сферы выступае Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю. Але першая прыступка, і гэта вельмі важна, — выканкамы на месцах.

Заканадаўства — у галіне і зваротаў грамадзян, і абароны правоў спажыўцоў — сведчыць аб тым, што першапачаткова правы спажыўца падлягаюць абароне на той тэрыторыі, дзе і адбылася падзея: прададзены няякасны тавар або няякасна аказана паслуга. Калі спажывец не згодны з вынікамі разгляду зваротаў на ўзроўні выканкама, ён можа звярнуцца ў аблвыканкам. Альбо ў Мінгарвыканкам, калі першапачаткова яго пытанне разглядалася на ўзроўні адміністрацыі раёна сталіцы.

На апошніх стадыях падключаецца МАРГ. Паралельна і інтэгравана з намі вялікую работу праводзяць грамадскія арганізацыі спажыўцоў. Гэта так званая грамадская абарона, — патлумачыла эксперт. — І дзяржаўная, і грамадская абарона аказваюць дапамогу спажыўцу на бязвыплатнай аснове.

Наступная ступень — судовая абарона. Падача іску ў суд па абароне правоў спажыўцоў не прадугледжвае выплату дзяржпошліны.

## ПРАВІЛЫ — АДЗІНЫЯ

Важнай падзеяй стала прыняцце Беларуссю і Расіяй адзіных правілаў у галіне абароны правоў спажыўцоў, сказала прадстаўнік МАРГ.

— Дэкрэтам Вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы ад 6 снежня 2024 года зацверджаны адзіныя правілы ў галіне абароны правоў спажыўцоў, якія ўстанаўліваюць рамачныя прававыя асновы, накіраваныя на збліжэнне нацыянальных заканадаўстваў дзвюх краін, — адзначыла Іна Гаўрыльчык. — Мы будзем імкнуцца да таго, каб у галіне абароны правоў спажыўцоў заканадаўства не мела істотных адрозненняў. Каб і спажыўцу былі зразумелыя яго правы, і бізнес не затрачваў намаганні, час, тэхналогіі, каб адаптавацца да ўмоў працы ў іншай краіне. Адзіныя правілы носяць рамачны характар, і ў гэтых рамках мы будзем удасканальваць сваё нацыянальнае заканадаўства. Гэта будзе мікс, які збярэ найлепшыя нормы з беларускага і расійскага заканадаўства.

Адзіныя правілы намецілі і перспектыўныя моманты: напрыклад, дадзена вызначэнне таго, што такое «лічбавы прадукт».

— Днямі завяршылася работа па падпісанні ключавых дакументаў па адзіных правілах, было заключана пагадненне па забеспячэнні роўных правоў спажыўцоў, — адзначыла прадстаўнік МАРГ. — Пагадненнем вызначана стварэнне Савета Саюзнай дзяржавы па абароне правоў спажыўцоў. На парытэтных пачатках туды ўвойдуць прадстаўнікі МАРГ і «Расспажыўнагляду», а таксама грамадскіх арганізацый спажыўцоў. Плануецца, што пасяджэнні Савета будуць праводзіцца не радзей, чым двойчы ў год, а першае адбудзецца ўжо ў маі.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

**У тэму**

## На што выдаткуем грошы?

### Белстат ацаніў выдаткі сярэднестатыстычнай беларускай сям'і

**На спажывецкія выдаткі беларуская сям'я за месяц выдаткоўвае 70,4 % свайго бюджэту, падлічыў Белстат падчас выбарачнага абследавання хатніх гаспадарак у 2024 годзе.**

Усяго за месяц беларуская сям'я траціць у сярэднім 2319,8 рубля, а наяўныя рэсурсы ў разліку на хатнюю гаспадарку статыстыка ацэньвае ў сярэднім у 2415,2 рубля за месяц. У гарадах людзі трацяць больш, прыводзіць звесткі Белстат (2537,7 рубля на месяц), у сельскіх населеных пунктах — менш (2018,5 рубля).

Калі казаць пра структуру спажывецкіх выдаткаў, то на прадукты харчавання прыпадае 37,4 % месячнага сямейнага бюджэту, на нехарчовыя тавары, яны ж «тавары адкладзенага попыту» — 36 %, а на аплату паслуг — 24,1 %.


## Извещение о проведении **1 апреля 2025 года** повторных аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС»

**Сведения о продаваемом имуществе (предмете торгов)**

| № предмета торгов | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Сведения о земельном участке | Начальная цена, с учетом НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-113573 общей площадью 1181,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А, наименование – здание промбазы, назначение – здание специализированное иного назначения. Обременение: аренда (23,1 кв. м – по 31.03.2025; 250 кв. м – по 31.12.2025) | Площадь – 0,1607 га, кадастровый номер – 141000000001005239 | 171 044,39 | 17 100,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. номером 110/С-117144 общей площадью 1212,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское шоссе, 20А/6, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | Площадь – 0,2238 га, кадастровый номер – 141000000001005216 | 142 116,34 | 14 200,00 |
| 3 | Капитальное строение с инв. номером 420/С-33082 общей площадью 1066,6 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Коммунистическая, д. 38А, наименование – магазин № 43, назначение – здание специализированное розничной торговли; капитальное строение с инв. номером 420/С-33277* общей площадью 138,6 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Коммунистическая, д. 38, наименование – магазин № 51, назначение – здание специализированное розничной торговли; капитальное строение с инв. номером 420/С-5931 общей площадью 92,7 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Докучаева, 4, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; капитальное строение с инв. номером 420/С-46997 общей площадью 164,1 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Докучаева, д. 2, наименование – магазин № 52, назначение – здание специализированное розничной торговли. * Обременение: аренда по 07.09.2026 | Площадь – 0,3387 га, кадастровый номер – 441300000010000096 | 667 869,12 | 66 700,00 |
| 4 | Капитальное строение с инв. номером 633/С-10565 общей площадью 66,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, Будславский с/с, п. Будслав, наименование – магазин № 50, назначение – здание специализированное розничной торговли | Площадь – 0,0395 га, кадастровый номер – 624080602101000023 | 3 408,00 | 340,00 |
| 5 | Капитальное строение с инв. номером 633/С-10564 общей площадью 64,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, Княгининский с/с, аг. Княгинин, ул. Привокзальная, д. 81, наименование – магазин № 42, назначение – здание специализированное розничной торговли; отопительный котел «Тисом» с инв. номером по бух. учету 080840 | Площадь – 0,0379 га, кадастровый номер – 624082004601000184 | 4 222,00 | 420,00 |
| 6 | Капитальное строение с инв. номером 413/С-528 общей площадью 48,1 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Свислочский р-н, Порозовский с/с, г. п. Порозово, ул. Ленина, 12, наименование – автостанция, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта; капитальное строение с инв. номером 413/С-529 общей площадью 13,4 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Свислочский р-н, Порозовский с/с, г. п. Порозово, ул. Ленина, 12/1, наименование – сарай, назначение – здание нежилое | Площадь – 0,0446 га, кадастровый номер – 425255700001000037 | 2 514,00 | 250,00 |
| 7 | Капитальное строение с инв. номером 240/С-45976 общей площадью 115,9 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Межевский с/с, аг. Заполье, ул. Станционная, 2, наименование – здание магазина № 61, назначение – здание специализированное розничной торговли; капитальное строение** с инв. номером по бух. учету 084792 общей площадью 22,0 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Межевский с/с, аг. Заполье, ул. Станционная, 2/1, наименование – здание склада | Площадь – 0,0370 га, кадастровый номер – 223684400001000005 | Одна базовая величина | Одна базовая величина |

** Согласно пункту 2 Положения «О порядке распоряжения неиспользуемым имуществом хозяйственных обществ», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 19.09.2022 № 330 «О распоряжении имуществом», продажа неиспользуемого имущества на торгах (на аукционе или по конкурсу) либо без проведения торгов может осуществляться в том числе без наличия документов, удостоверяющих государственную регистрацию его создания, возникновения прав, ограничений (обременений) прав на него

Продаваемое имущество выставлено на торги по фактическому состоянию, техническим характеристикам и комплектации. Рекомендуется проведение осмотра

**Продавец имущества:** ОАО «ДОРОРС», ул. Брестская, 77/1-2, 220099, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условия торгов:** победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 2 (двух) процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков), документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, кодификатор назначения платежа – 40901, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах 01.04.2025 по предмету торгов №__.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **1 апреля 2025 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов). Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 17.03.2025 по 28.03.2025** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (017) 240-62-06.

**Телефоны для справок:** (017) 360-42-22, 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 240-62-06; (017) 240-61-88 (ОАО «ДОРОРС»).

Дополнительная информация размещена на сайте **www.mgcn.by** в разделе «Недвижимость в собственность».

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** У пачатку тыдня рэкамендуецца больш прыслухоўвацца да іншых людзей, але не варта расказваць выпадковым спадарожнікам падрабязнасці пра сваё асабістае жыццё. У сярэдзіне і ў канцы тыдня вы можаце адчуваць эмацыянальны і творчы ўздым. Гэта будзе асабліва прыкметна па жанчынах і дзяўчатах, якія стануць незвычайна прывабна выглядаць.

**ЦЯЛЕЦ.** Пачатак тыдня можа быць звязаны з нечаканасцямі, магчыма, прыйдзецца поўнасцю або часткова адмовіцца ад сваіх планаў. Гэты час багаты стратамі і нерацыянальным расходаваннем грошай. Вельмі непажадана ўступаць у фінансавыя адносіны з сябрамі, даваць і браць у пазыку, рабіць пакупкі. У сярэдзіне і ў канцы тыдня ўзмоцніцца патрэба ў цішыні і спакоі.

**БЛІЗНЯТЫ.** У пачатку тыдня зоркі раяць трымацца ў цені і не прыцягваць да сябе ўвагу па публіцы. Найбольш праблемная тэма тыдня — кар'ера. У сярэдзіне і ў канцы тыдня можа надысці ўдалы час. Не адмаўляйцеся скласці кампанію сябрам. Шукайце зносін з людзьмі, якія блізкія вам па духу.

**РАК.** У пачатку тыдня можаце трапіць у складаную сітуацыю, звязаную з веі рагоднай шкодай вашай рэпутацыі ў той ці іншай форме. Сярэдзіна і канец тыдня павінны складвацца ў цэлым спрыяльна. Многія могуць разлічваць на атрыманне прэміі ці іншага матэрыяльнага ўзнагароджання. Таксама палепшацца адносіны ў сям'і.

**ЛЕЎ.** Пачатак тыдня — вельмі нестабільны перыяд. Могуць адбыцца любыя надзвычайныя здарэнні. У першую чаргу будзьце абачлівей з фінансамі: непажадана даваць і браць грошы ў пазыку. У сярэдзіне і ў канцы тыдня сітуацыя кардынальна зменіцца да лепшага.

**ДЗЕВА.** У пачатку тыдня сутыкнецеся з неспрыяльнымі знешнімі абставінамі. Непажадана падымаць і спрабаваць абмяркоўваць вострыя і прынцыповыя пытанні — гэта можа стаць падставай для пагаршэння адносін. Неспрыяльны час для шлюбу або падпісання любога дагавора.

**ШАЛІ.** Зоркі раяць з усёй сур'ёзнасцю паставіцца да свайго здароўя. Не перагружайце сябе фізічна. У сярэдзіне і ў канцы тыдня надыходзіць спрыяльны час для асабістага жыцця. Паспяхова праходзяць рамантычныя знаёмствы і палепшаюцца шлюбныя адносіны. У гэтыя дні добра здаваць экзамены, выступаць са сцэны, удзельнічаць у конкурсах і спаборніцтвах.

**СКАРПІЁН.** Пачатак тыдня стане сур'ёзным выпрабаваннем для пачуццяў. Старайцеся не даваць падставы для сумневаў і пастаўцеся з разуменнем да каханага чалавека. Ёсць рызыка захапіцца азартнымі гульнямі і прайграць шмат грошай. У сярэдзіне і ў канцы тыдня вы зможаце навесці ідэальны парадак на працы і дома.

**СТРАЛЕЦ.** Можа ўскладніцца сітуацыя ў сям'і, магчыма, вам прыйдзецца браць на сябе дадатковыя абавязкі, расходаваючы шмат сіл і часу. Устрымайцеся ад абмеркавання пытанняў, звязаных са спадчынай маёмасці. У сярэдзіне і ў канцы тыдня вызначаецца удатны час для рамантычных прыгод і творчасці.

**КАЗЯРОГ.** У пачатку тыдня праявіце асцярожнасць у кантактах. Ад новых знаёмстваў лепш устрымацца. У сярэдзіне і ў канцы тыдня будзе панаваць сямейная ідылія. Добры час для аднаўлення адносін з блізкімі сваякамі і бацькамі.

**ВАДАЛІЎ.** У пачатку тыдня найбольш складаная і праблемная тэма можа стаць фінансавае пытанне. Не выключана, што вам спатрэбіцца несці буйныя незапланаваныя выдаткі. Не лепшы час для буйных пакупак. У сярэдзіне і ў канцы тыдня складваецца спрыяльны час для зносін з шырокім колам сяброў і знаёмых.

**РЫБЫ.** Рыбы ў пачатку тыдня рызыкуюць дапусціць памылку або стаць ахвярай падману з боку нядобрасумленных людзей. У сярэдзіне і ў канцы тыдня будуць пазітыўныя перамены. Вы зможаце паспяхова вырашыць матэрыяльныя пытанні. Магчыма, вам выплацяць грашовую прэмію ці будуць іншыя фінансавыя паступленні.

## АЛЁ, НАРОД!..

ВЯСЁЛЫЯ І ЦІКАВЫЯ ГІСТОРЫІ АД ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ»

Вядучая рубрыкі Валянціна ДОЎНАР.

### ЛЮБОЎ НЕ БЛІНЦЫ: УЛЮБІШСЯ І КАНЦЫ



**Наш зямляк знакаміты дыпламат Андрэй Грамыка лічыў, што лепш дзесяць гадоў весці перамовы, чым адзін дзень — вайну. І меў жа рацыю, бо яна, тая вайна, вельмі небяспечная, перш за ўсё — сваімі наступствамі, нават вельмі, вельмі далёкімі.**

У канцы 50-х гадоў мінулага стагоддзя ў нашых вёсках і гарадах мужчын было вобмаль (адкуль жа ім брацца?) — не хапала для ўсіх жанчын... Вось тыя, што мелі — жонкі, — і адстойвалі сваю «ўласнасць» як толькі маглі. У нас, напрыклад, па начах білі шыбы саперніцам. Тыя затыкалі дзюркі падушкамі. Раніцай вёска выганяе ў поле кароў і адразу бачыць, да каго залётнік прыходзіў.

...У нас вось такім быў Кірылавіч, калгасны брыгадзір. Ён жа — цар, бог і воінскі начальнік, важнейшы, можна сказаць, чым старшыня, бо той высакавата, «над людзьмі», у канторы болей сядзіць, а гэты — побач, на мясцовасці. Увесь люд як на далоні ў яго! Не дзіва, што кожнага разгледзіць, што некага ўпадабае... Тую ж вясёлую ўдавіцу Кацю. Ёй пасля — і работа найлягчэйшая, і «лішнія» працадні. А да ўсяго — кароткі дзень, бо пад вечар галава пачынала балець. Яна брыгадзіру пажаліцца, — той адразу: «Ідзі дадому, лячыся...» Каця тады ледзь не подбегам... Каб па гаспадарцы хутчэй управіцца, каб прычапурыцца ды стол падрыхтаваць.

Карацей, ну ўсё па прыпеўцы:

*Брыгадзіру дагадзіла:*
*З ім да ранку прабыла,*
*На работу не хадзіла*
*І стаханаўкай была.*

Іншыя цёткі ўсё гэта бачылі, зранку да вечара працавалі ды злавалі, бо ў іх — «гуртавое — чартавое»: «ні вырабаткі, ні заробку», як адна кабета казала. Яна яшчэ літару «р» не выгаворвала, таму ў гэтай фразе не толькі крыўда была...

Але ж і смешнага — ну нічога!

Карацей, згаварыліся бабы і ў той вечар, калі ў Каці галава «забалела», цямком акружылі яе сядзібу: заселі і з вуліцы, і з гарода.

Убачылі, што прыйшоў да яе Кірылавіч (жонцы ён казаў, што ў канторы дзяжурыць — аж да самай раніцы); пачулі, што ў акенца пастукаў, што дзверы адчыніліся; пачакалі яшчэ, пакуль галубкі павітаюцца, пакуль пачастуюцца, ды святло патушаць... А тады гайда ў вароты грукаць.

Кірылавіч, мусіць, вельмі спалохаўся: у споднім з хаты выскачыў, кінуўся ў гарод, а там — «засада».

Не прыдумаў, як патлумачыць, чаму ў кальсонах. Адразу папрасіў: «Бабачкі, не губіце, не здавайце мяне!»

А ў тых «бабачак» і адказ гатовы. Кажуць, што змаўчаць, не здадуць ні жонцы, ні ў парткам, калі ён махляваць перастане з «заробкам ды з вырабаткай», калі каня будзе добрага даваць для апрацоўкі гародаў, а не такога жарабка, як сам...

Кірылавіч пакляўся і пабажыўся! А бабы — як тыя пракуроры: усё, што мелі сказаць, сказалі ды адпусцілі. Праўда, перш чым па дамах разысціся, парагаталі яшчэ.

Што далей было?

Ды нічога такога: у брыгадзе стала болей парадку і справядлівасці, у Каці перастала балець галава. Але ж праўду кажуць, што сэрца не конь, яго не закілзаеш, што любоў не блінцы — улюбішся і канцы... Кірылавіч хоць зрэдку, хоць калі-нікалі ды заходзіў да ўдавіцы.

І вокны ёй брыгадзірыха не біла. Мусіць, разумела, што страціць гаспадара — справа плёвая. А вось жыць без яго — не прывядзі гасподзь!

**С. Вароніна,**
*Быхаўскі раён.*

## Надвор'е на заўтра

| | | |
|---|---|---|
| МІНСК | 757 мм рт.сл. | -3..-1°C / +4..+5°C |
| ВІЦЕБСК | 756 мм рт.сл. | -3..-1°C / +3..+5°C |
| МАГІЛЁЎ | 756 мм рт.сл. | -3..-1°C / +4..+5°C |
| ГОМЕЛЬ | 757 мм рт.сл. | -1..0°C / +1..+4°C |
| ГРОДНА | 767 мм рт.сл. | -3..-1°C / +4..+6°C |
| БРЭСТ | 759 мм рт.сл. | -2..0°C / +5..+7°C |

Паводле даных Белгідрамета

### ...у суседзяў

МАСКВА +3..+4°C

С.-ПЕЦЯРБУРГ -3..+1°C

**Месяц**

*Поўня 14.03—21.03. Месяц у сузор'і Шаляў.*

**Геамагнітныя ўзрушэнні**




Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура
— малая геамагнітная бура



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

## 15 САКАВІКА — Даты, Падзеі, Людзі

У краіне

**1410** год — адбыўся напад крыжацкіх войскаў на Ваўкавыск. Акурат была Вербная нядзеля, і таму крыжацкі напад выглядаў блюзнерствам. А мэтай нападзення было забойства князя Вітаўта, які знаходзіўся ў Ваўкавыску на свяце. Крыжакі хацелі такім чынам разбурыць ваенны саюз Польшчы і ВКЛ напярэдадні рашаючых бітваў.

**1930** год — нарадзіўся (г. Віцебск) Жарэс Іванавіч Алфёраў, савецкі і расійскі фізік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі ў галіне фізікі ў 2000 годзе за распрацоўку паўправадніковых гетэраструктур і стварэнне хуткіх опта- і мікраэлектронных кампанентаў (сумесна з Гербертам Кромерам і Джэкам Кілбі). Яго даследаванні адыгралі вялікую ролю ў інфарматыцы.

**1994** год — прынята Канстытуцыя Беларусі. Яна ўпершыню ў гісторыі беларускай дзяржаўнасці замацавала статус рэспублікі як унітарнай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы, устанавіла прынцыпы дэмакратычнага ладу, прыярытэт правоў і свабод чалавека.

У свеце

**44** год да н. э. — група сенатараў на чале з Гаем Касіем Лангінам і Маркам Юніем Брутам арганізавала змову, каб забіць Цэзара і аднавіць Рэспубліку. На пасяджэнні сената ў сакавіцкія іды (15 сакавіка) змоўшчыкі накінуліся на дыктатара з кінжаламі і нанеслі яму 23 раны, ад якіх ён памёр на месцы.

**270** год — як мяркуецца, у гэты дзень нарадзіўся Мікалай Цудатворца, мірлікійскі архіепіскап IV стагоддзя. Таксама вядомы як Свяціцель, або Святы Мікалай, Мікола Мірлікійскі і Мікола Угоднік. 9 (22) мая 1087 года яго мошчы перавезлі ў італьянскі горад Бары. У выніку гэты дзень стаў адным з дзён яго памяці, які шырока адзначаецца.

**1867** год — аўстрыйцы і венгры дамовіліся пра пераўтварэнне Аўстрыі ў дуалістычную дзяржаву — Аўстра-Венгрыю.

**1892** год — у ЗША быў запатэнтаваны эскалатар.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы несуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11 291. Індэкс 63850. Зак. № 641. Нумар падпісаны ў 19.30 14 сакавіка 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12